Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 САКАВІКА 2022 г.
СЕРАДА
№ 56 (29678)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



ІГАР СТОМА: «РАБІ ДАБРО ЛЮДЗЯМ» 5



НЕСАЛОДКАЕ ЖЫЦЦЁ З ДЫЯБЕТАМ 13

## КОРАТКА

- Дні адкрытых дзвярэй стартуюць 26 сакавіка ў БДУ.
- **Кіраўнік «Белдзяржхарчпрама»: Беларусь з лішкам забяспечана цукрам і соллю.**
- Мінлясгас зняў абмежаванні па рэалізацыі пілапрадукцыі для насельніцтва па фіксаваных цэнах.
- **З-за выпальвання сухой травы за тыдзень загінулі сем чалавек.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Міністэрства каардынуе і кантралюе работу па цэнаўтварэнні на сацыяльна значныя прадукты харчавання. Выпрацаваны шэраг прапаноў, ідзе карпатлівая работа па ўдасканаленні нарматыўна-прававых актаў. Гэта дасць магчымасць больш забяспечыць баланс інтарэсаў паміж вытворцамі, гандлёвымі арганізацыямі і, самае галоўнае, спажыўцамі, а таксама забяспечыць спажыўцоў беларускімі або ўвезенымі ў нашу краіну прадуктамі харчавання па справядлівай цане. Таксама ўзмоцнены кантроль і па нехарчовай групе тавараў. Уся інфармацыя збіраецца і аператыўна запытваюцца даныя ў гандлёвых аб'ектаў або імпарцёраў, як былі сфарміраваны цэны. Наша асноўная задача — захаваць прысутнасць тавару на паліцы, але выключыць спекуляцыі на рынку».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Свой народ мы, як і заўсёды, поўнасцю забяспечым айчыннымі прадуктамі»

**Вясна не толькі каляндарная, але і кліматычная дала падставы для абмеркавання ў Палацы Незалежнасці правядзення сёлетніх палявых работ. Прэзідэнт паставіў перад аграрыямі задачу вырасціць і сабраць не менш як 9 мільёнаў тон збожжа, 700 тысяч тон рапсу і 5 мільёнаў тон цукровых буракоў, каб забяспечыць перапрацоўчыя прадпрыемствы агракомплексу сыравінай, а жывёлагадоўлю — кармамі. Размова выйшла сур'ёзная: таго патрабуюць абставіны. Для Беларусі, краіны з буйным аграрным комплексам, няпростая сітуацыя ў свеце — шанц дадаткова зарабіць на экспарце прадуктаў харчавання. Рэсурсы для рыўка ёсць, але і праблем дастаткова: дзесьці — безгаспадарнасць, дзесьці — дрэнная дысцыпліна, безыніцыятыўнасць улады на месцах, недахоп амбіцыйных маладых кадраў у сферы. Настрой сустрэчы — выключныя шчырасць і аб'ектыўнасць. Як і вымагае час, бо гэтая пасяўная кампанія асаблівая, заўважыў ва ўступным слове Аляксандр Лукашэнка, і растлумачыў, чаму.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Векапомнае

# КОЖНЫ ТРЭЦІ — У ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

## У мемарыяльным комплексе «Хатынь» адбыўся рэспубліканскі мітынг-рэквіем

**79 гадоў таму нацысты і іх памагатыя знішчылі мірную вёску Хатынь, зажыва спалілі яе жыхароў. У агні загінулі 149 чалавек — 74 дарослых і 75 дзяцей. Самай маленькай ахвяры фашысцкай расправы было ўсяго сем тыдняў...**

Учора ў мемарыяльным комплексе было надзвычай шматлюдна. Каб пакланіцца гэтай святой зямлі і ўскласці кветкі да мемарыяла смутку і народнай памяці, прыехалі дзясяткі тысяч людзей. Дэлегацыі дзяржаўных органаў улады, арганізацый, прадстаўнікі кожнага раёна Беларусі, сярод якіх нямала моладзі, прыбывалі ў Хатынь да самага вечара.

— Мемарыяльны комплекс «Хатынь» — даніна памяці кожнаму трэцяму беларусу, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, — адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**. — Сёння ўсё, што звязана з Хатынню і тысячамі такіх вёсак, актуальнае як ніколі: не толькі для жыхароў нашай краіны, а і тых гасцей, якія прыязджаюць да нас. Здавалася, нашы бацькі знішчылі фашызм у 1945-м, але аказваецца, што зерне нацызму ёсць і сёння.

СТАР. 3



Фота БелТА.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# Дастаткова адной іскры

## Што трэба прадугледзець, каб навядзенне парадку не прывяло да пажару?



Фота Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

**Яшчэ не паспеў сысці снег, як людзі пачалі прыбіраць свае прысядзібныя тэрыторыі. Аднак, наводзячы парадак на зямлі, як гэта часта бывае, грамадзяне забываюцца пра самае галоўнае — бяспеку. І калі нядаўна супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у асноўным выязджалі на тушэнне ўзгаранняў у хатах, то апошнім часам яны вымушаны змагацца з вогненнай стыхіяй яшчэ і ў экасістэмах: з гэтай нагоды кожны дзень ратавальнікам паступае больш за сотню званкоў.**

Людзі, якія прыбіраюць смецце такім чынам, не задумваюцца яшчэ і аб тым, якую шкоду яны наносяць раслліннаму свету. Спальванне сухастою прыводзіць да збяднення расліннасці, павышэння кіслотнасці і памяншэння ўрадлівасці глебы. Амаль усё жывое, што знаходзіцца ў сухой траве або на паверхні зямлі, гіне падчас узгарання. Нярэдка на папялішчах знаходзяць спаленыя птушыныя гнёзды, грызуноў, вожыкаў і нават зайчанят.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!
Ідзе падпіска на II квартал 2022 года
ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «Свой народ мы, як і заўсёды, поўнасцю забяспечым айчыннымі прадуктамі»

## ВАЖНА ЯК НІКОЛІ

«Пасяўная кампанія для Беларусі сёлета важная як ніколі. Мы праводзім яе на фоне гарачага канфлікту каля нашых паўднёвых граніц. А таксама ва ўмовах вялізнага санкцыйнага ціску на Расію як галоўны рынак нашай краіны і галоўнага саюзніка-пастаўшчыка сыравіны, беспрэцэдэнтнага росту цэн ва ўсім свеце на вуглевадароды, угнаенні і харчаванне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, па яго словах, пагаршае ўмовы пасяўной кампаніі і засушлівае надвор'е.

«Збожжа сёння — гэта практычна новае золата ці нафта. Магчыма, нават будзе і даражэй. І паколькі адзін з асноўных сусветных пастаўшчыкоў (Украіна) наўрад ці зможа правесці паўнавартасную пасяўную кампанію, цэны будуць расці і далей. У самых бедных краінах планеты ААН ужо прадказвае голад. Безумоўна, найперш — наша ўласная харчовая бяспека. Мы павінны забяспечыць усім неабходным беларускі народ. Свой народ мы, як і заўсёды, поўнасцю забяспечым айчыннымі прадуктамі», — упэўнены Прэзідэнт.

Але галоўнае для аграрыя — яшчэ і залажыць стабілізацыйныя фонды. У Беларусі ёсць для гэтага ўсё неабходнае, мяркуе беларускі лідар, — ворныя землі, айчынныя ўгнаенні, селекцыйнае насенне, сельскагаспадарчая тэхніка, сучасныя перапрацоўчыя заводы, людзі, якія ўмеюць працаваць.

Пры такіх рэсурсах нельга забываць і пра нарошчванне экспарту, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. За 2021 год продажы за межы выраслі больш чым на 17 працэнтаў, у грашовым выражэнні склалі амаль 7 мільярдаў долараў.

«Сёлета неабходна перавысіць гэтыя паказчыкі. Гэта каля 17 працэнтаў у агульным аб'ёме нашых замежных паставак. Летась мы адпраўлялі прадукцыю ў 110 краін. Гэта рэкордны паказчык. Але ў Беларусі дастаткова рэзерваў і для далейшага росту экспарту, — канстатаваў кіраўнік краіны. — Не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Для сельгасвытворчасці — вельмі добры момант, нарасціўшы вытворчасць, паправіць фінансавы стан».

Сёлета, паставіў задачу Прэзідэнт, аграрыям неабходна вырасціць 9 мільёнаў тон збожжа, 700 тысяч тон рапсу і 5 мільёнаў тон цукровых буракоў. «На гэта звяртаю асаблівую ўвагу. Буракі, як і хлеб, соль ды іншыя некалькі харчовых пазіцый, — стратэгічны тавар. Вы бачыце, як за цукар ідзе барацьба. На шчасце, толькі ў магазінах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН ДЛЯ ПАСЯЎНОЙ

На думку кіраўніка дзяржавы, цяпер галоўнае — правядзенне палявых работ са строгім захаваннем галіновых рэгламентаў. Для гэтага трэба ўзмацніць спагнанні за тэхналагічныя і арганізацыйныя парушэнні, апаратыўна выяўляць і ліквідаваць недахопы.

«Расхлябанасць, мужыкі, закончылася. Неабходна зрабіць усё, што толькі магчыма зрабіць цяпер для таго, каб у час укінуць зярнятка ў зямлю. Вільгаці не хапае, таму тэмпы пасяўной павінны падвоіцца. Дзесяць дзён і ўсё — мы павінны пасеяць», — заклікаў Прэзідэнт.

На ўзроўні ўрада, дадае ён, прыняты ўсе рашэнні па пытаннях фінансавання, забеспячэння палівам, падрыхтоўцы тэхнікі для правядзення пасяўной. «Усё, што неабходна было зрабіць з цэнтра, — зроблена. Засталося дакладна выканаць свае задачы на месцах. Але, як мне дакладваюць, некаторыя рэгіёны сёння прабуксоўваюць. У першую чаргу ёсць пытанні па тэхніцы. У прыватнасці, адзначаюцца нізкія тэмпы падрыхтоўкі энерганасычаных трактароў. Напрыклад, каля 80 працэнтаў у Віцебскай вобласці. У чым цяжкасці? Калі будзе завершаны рамонт? Гэта пытанне не толькі па трактарах, але і па камбайнах, і зернесушыльных комплексах. Потым часу рамантаваць не будзе», — зрабіў заўвагу кіраўнік краіны.

Падкрэсліў ён праблему не толькі рамонту тэхнікі, але і ўкамплектаванасці механізатарамі. Папоўніць іх штат Аляксандр Лукашэнка прапануе за кошт студэнтаў, часовых работнікоў з іншых галін. Прэзідэнту расказалі, як дапамагаюць сельгасвытворцам машынабудаўнікі.

«Як мне на месцах дакладваюць, і Гомсельмаш, і МТЗ, і МАЗ папрацавалі ў гэтым плане і дапамаглі з рамонтам энерганасычанай тэхнікі ў вызначаных губернатарамі цэнтрах», — сказаў Прэзідэнт.

Наступная праблема для абмеркавання — нізкія тэмпы назапашвання мінеральных угнаенняў. Тут неабходная каманда ад прэм'ер-міністра.

«Хапае ж калію. Мы яго дабываем колькі заўгодна. Не ўвесь прадаём. Аддайце сялянам, праз хлеб, іншыя прадукты калій прададзім. А азот увесь павінен быць у гаспадарках. Без азоту не будзе ўраджаю. Тое ж самае і фосфар. У нас тры заводы, і яны працуюць. Няхай у гэты перыяд забяспечаць усім неабходным», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Найбольшую занепакоенасць выклікае ў яго стан спраў у Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях. Менавіта там неабходны прарыў. «Таму аглобілі ў рукі — і на заводы. Забірайце мінеральныя ўгнаенні. Як толькі будзе магчымасць, уносьце ўгнаенне ў глебу. Падкармiце ў час азімыя. Не падкорміце — не атрымаеце ўраджай. У найбліжэйшы час пройдзе дождж, снег — вільгаць будзе», — мяркуе Прэзідэнт.

Яшчэ важныя пытанні па тэме сустрэчы — забеспячэнне насеннем, сродкамі ахоўвы раслін і палівам.

Па словах кіраўніка дзяржавы, насенне, якое не вырошчваецца ў Беларусі, закупілі на працягу года ў Расіі. Пастаўкі ідуць па тэрмінах. Ёсць уласныя запасы і паліва, дадае Прэзідэнт, і іх трэба выкарыстоўваць.

## «ПОЛЕ» ДЛЯ ФЭЙКАЎ

Аляксандр Лукашэнка прасіць далажыць па кожным з пералічаных момантаў, бо нават сельская гаспадарка дае глебу для рознага роду фэйкаў і інфармацыйных атак.

«У выхадныя дакладваюць мне, чытаю: страшнай зброяй для нас стала насенне цукровых буракоў (Прэзідэнт каментуе выказванні, што Еўропа не дасць закупіць збожжа для сяўбы. — «**Зв.**»). Толькі неадукаваныя людзі могуць паверыць у гэтыя фэйкі. Насенне рыхтавалі ўсю восень і зіму. І яно гатовае. Засталося нейкую колькасць па цукровых буракаx завезці з Расіі. Яны сёння ажыццяўляюць пастаўкі», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Ён дадае, што насенне для цукровых буракоў закуплялі заўсёды, але можам нешта стварыць і самастойна.

«Я спецыяльна папрасіў даць інфармацыю пасля гэтых фэйкаў па цукровых буракаx. Я праблем не бачу. А стаўлю задачу высеяць да пяці мільёнаў, каб атрымаць ураджай цукровых буракоў. Гэта вялікія грошы», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён папрасіў чыноўнікаў падцягнуць дысцыпліну на вёсцы і ў агрaгарадках. «Пасяўная кампанія — гэта імгненне. Тыдзень, другі — закончылі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Першым з дакладам на нарадзе выступіў нядаўна прызначаны **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО**. Ён расказаў, што пасеяць яравыя неабходна на плошчы 2 мільёны 266 тысяч гектараў і паклапаціцца аб азімых, якія займаюць 1 мільён 900 тысяч гектараў.

«Азімыя збожжавыя культуры знаходзяцца ў здавальняючым стане. Пашкоджанняў не адзначана. Пад запланаваныя пасяўныя плошчы па краіне сфарміраваны асноўны і страхавы фонды насення яравых збожжавых і бабовых культур», — паведаміў міністр.

Журналістам Ігар Брыло паўтарыў, што мэта для аграрыяў — правесці ў тэрмін вясенне палявыя работы і сабраць дзевяць мільёнаў тон збожжа.

«Наша асноўная задача — у кароткія тэрміны атрымаць угнаенні з нашых заводаў, паставіць іх у вобласці, каб працэнт забяспечанасці азотам, каліем, фосфарам быў высокі і была магчымасць своечасова падкарміць культуры», — сказаў Ігар Брыло.

Па яго словах, для пасяўной неабходна 35 тысяч чалавек механізатараў, не хапае трох тысяч работнікаў. Іх плануюць прыцягваць заахвочваннем з прамысловых прадпрыемстваў і вучэбных устаноў.

Міністр адзначыў, што некаторыя віды насення паступаюць нам па імпарце, асноўныя пастаўкі ідуць добра, але адчуваецца недахоп невялікай колькасці насення кукурузы.

«Самае галоўнае, што гэта невялікі працэнт. Асноўнае — наша беларускае. Насеннем гэтая пасяўная кампанія забяспечана», — запэўніў кіраўнік ведамства.

Засеяць палі ён ад імя аграрыяў паабяцаў на працягу 10 дзён. Пачаць плануюць у канцы сакавіка — красавіку, але ўсё залежыць ад надвор'я: наколькі хутка сыдзе з палёў вільгаць.

Як паведамляе блізкі да прэс-службы Прэзідэнта тэлеграм-канал «Пул Першага», размова па тэме пасяўной працягнулася пасля абеду ва ўрадзе. Ну а кіраўнік краіны паабяцаў па даўняй традыцыі пабываць у рэгіёнах і паглядзець, як ідзе пасяўная кампанія.

**Марыя ДАДАЛКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## У цэнтры ўвагі

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Каб стымуляваць высокія спартыўныя вынікі»

**У Савеце Рэспублікі прайшло пасяджэнне экспертнага савета па актуальных пытаннях развіцця фізічнай культуры і спорту.**

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў знаходзіліся пытанні стымулявання спартсменаў да далейшага дасягнення высокіх спартыўных вынікаў і стварэння эфектыўных умоў арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу.

— У мэтах стварэння ўмоў для ўдзелу ў спартыўных мерапрыемствах спартсменаў высокага класа, трэнераў і іншых спецыялістаў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы спартсменаў, неабходна ўдасканальваць сістэму матэрыяльнага стымулявання высокіх спартыўных вынікаў, парадак прызначэння і выплаты імянных стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы фізічнай культуры і спорту, парадак выдачы прызоў спартсменам, а таксама выплаты ўзнагароджанняў трэнерам і іншым спецыялістам, — перакананая **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

Паводле яе меркавання, неабходна спрыяць павышэнню эфектыўнасці падрыхтоўкі беларускіх спартсменаў і іх пасляхаваму выступленню на найбуйнейшых міжнародных спартыўных спаборніцтвах, стварэнню дадатковых умоў для якаснай арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэсу і стымулявання дасягнення імі высокіх спартыўных вынікаў.

— Трэба забяспечыць дзяржаўную падтрымку і дадатковыя сацыяльныя гарантыі спартсменам з інваліднасцю і асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія з'яўляюцца чэмпіёнамі Паралімпійскіх, Дэфлімпійскіх гульняў, пры дасягненні імі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, а таксама стварыць дадатковыя стымулы для маладых спартсменаў з інваліднасцю ў дасягненні імі высокіх спартыўных вынікаў, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

Як адзначыў у гутарцы з журналістамі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навукі, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ**, у ліку пытанняў, што трапілі ў поле зроку экспертаў, — магчымасць увядзення стыпендыі алімпійскім чэмпіёнам.

— Пасля завяршэння кар'еры і да пенсіі, — тлумачыць сенатар. — Яны аддавалі ўсё сваё жыццё спорту, дамагліся высокіх спартыўных вынікаў, але з тых ці іншых прычын, у тым ліку і з прычыны здароўя, не могуць працаваць нават у адміністрацыйнай дзейнасці.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША будзе складана стабілізаваць эканоміку і ўтрымаць яе ад спаду



Ураду будзе нялёгка дабіцца ў цяперашніх геапалітычных умовах «мяккай пасадкі» нацыянальнай эканомікі, утрымаўшы яе ад скочвання да рэцэсіі і забяспечыўшы зніжэнне ўзроўню інфляцыі ў краіне пры недапушчэнні росту беспрацоўя. Гэта прызнаў кіраўнік Федэральнай рэзервовай сістэмы (ФРС) ЗША Джэром Паўэл, паведаміла ТАСС. Акрамя таго, Паўэл зноў пацвердзіў, што сітуацыя ва Украіне, а таксама санкцыі, якія прымяняюцца Захадам у дачыненні да Расіі, нанясуць удар і па эканоміцы ЗША, і па сусветнай эканоміцы ў цэлым. На яго думку, гэтыя падзеі, верагодна, абмяжоўваюць эканамічную актыўнасць за мяжой і прывядуць да далейшага парушэння функцыянавання ланцужкоў паставак, што выявіцца ў «пераліванні» негатыўных наступстваў у амерыканскую эканоміку. Тым часам стала вядома, што амерыканскія фондавыя індэксы завяршылі таргі панядзелка зніжэннем пасля выступлення Джэрома Паўэла, якое аналітыкі назвалі больш «ястрабіным», чым пасля пасяджэння ФРС на мінулым тыдні.

### ЕС зацвердзіў першую ў гісторыі саюза абаронную канцэпцыю

Кіраўнікі МЗС і міністры абароны Еўрасаюза на сумесным пасяджэнні ў Брусэлі ўзгаднілі першую ў гісторыі саюза агульную канцэпцыю ў галіне абароны і бяспекі «Стратэгічны компас», што прадугледжвае фарміраванне еўрапейскіх сіл хуткага рэагавання, якія складаюцца з пяцітысячнага корпуса, паведаміла РІА «Навіны». У дакументе гаворыцца, у прыватнасці, што ЕС павінен больш рашуча і хутка дзейнічаць ва ўмовах крызісу, узмацніць гатоўнасць узброеных сіл, грамадзянскіх экспертаў, а таксама стварыць еўрапейскія сілы хуткага рэагавання з пяці тысяч вайскоўцаў для хуткіх дзеянняў ва ўмовах розных крызісных сітуацый. ЕС у рамках новай абароннай стратэгіі «Стратэгічны компас» дамовіўся аб правядзенні рэгулярных сумесных вучэнняў на моры і на сушы.

### На Шры-Ланцы вайскоўцы ўзялі пад ахову АЗС з-за дэфіцыту паліва

Армію падключылі да аховы парадку на АЗС дзяржаўнай Ceylon Petroleum Corp пасля таго, як натоўпы незадаволеных на некалькі гадзін перакрылі ажыўленую вуліцу ў Каломба, пратэстуючы супраць немагчымасці купіць газу для пліт, паведамілі журналістам высокапастаўлены прадстаўнік абароннага ведамства, перадаў інфармацыйны партал Channel News Asia. Паводле яго слоў, незадаволенасць расце па меры павелічэння чэргаў, вайскоўцаў вырашылі накіраваць на дапамогу паліцыі, каб пазбегнуць беспарадкаў. Шры-Ланка праходзіць праз найцяжэйшы крызіс з 1948 года, з моманту набыцця незалежнасці ад Вялікабрытаніі. Прэзідэнт краіны Гатабая Раджапакса склікаў на 23 сакавіка лідараў усіх палітычных партый для абмеркавання сітуацыі з эканомікай, але апазіцыя ўжо заявіла, што байкатуе гэтую нараду.

# КОЖНЫ ТРЭЦІ — У ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы выразна гэта бачым і на прыкладзе нашай суседкі Украіны, і ў Прыбалтыцы, і ў іншых краінах. Нам трэба гэтую памяць пераносіць з пакалення ў пакаленне, каб не дапусціць высpявання падобнага на сваёй зямлі: увекавечваць памяць герояў, выхоўваць моладзь і не дапусціць паўтарэння падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Паводле перакання **намесніка прэм'ер-міністра Ігара ПЕТРЫШЭНКІ**, кожны чалавек, які знаходзіцца ў Хатыні, яшчэ на працягу доўгага перыяду будзе ўспамінаць аб тых трагічных падзеях, якія былі на нашай зямлі, людзях, што схілілі свае галовы, каб мы маглі радавацца жыццю, развіваць краіну, вучыцца, займацца творчасцю, працаваць, паказваць спартыўныя дасягненні.

— Мы перажываем вельмі няпросты час — час інфармацыйнага тэрарызму і войнаў, — заявіў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. — Сёння наша галоўная задача — не дапусціць, каб у нас паўтарылася такая трагедыя, якая адбылася ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Хатыні і не толькі там.

Па словах **дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Аляксандра ВАЛЬФОВІЧА**, Хатынь — гэта вечны сімвал пакут і мужнасці беларусаў, усяго шматнацыянальнага народа, які жыў і жыве сёння на тэрыторыі нашай краіны. «Сёння некаторыя палітычныя кіраўнікі Захаду і Злучаных Штатаў Амерыкі імкнуцца сказіць гістарычныя факты, і гэта пачалося не ўчора, а робіцца вельмі даўно, пачынаючы з распаду Савецкага Саюза, — заўважыў дзяржсакратар. — Прыкладам таму з'яўляецца наша брацкая Украіна. Забыліся і на тэрыторыі калектыўнага Захаду, што менавіта савецкі салдат вызваліў Еўропу ад карычневай чумы — фашызму. У Беларусі ж усё робіцца дзеля таго, каб аб гэтым ніколі не забывалі».

Яскравы прыклад — заведзеная Генеральнай пракуратурай справа аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. Новымі падрабязнасцямі расследавання падзяліўся генпракурор. «З кожным днём высвятляецца ўсё больш фактаў, звязаных з генацыдам, — паведаміў **Андрэй ШВЕД**. — Вярнулася група спецыялістаў Генеральнай пракуратуры з архіва Расійскай Федэрацыі. Сёння можна казаць, што мы ведаем толькі 10 % інфармацыі (па актах Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі) аб маштабах трагедыі. Больш чым 90 % дакументаў нам трэба будзе вывучыць. З наступленнем цёплага перыяду ўзнаўляюцца работы на месцах. Толькі сёлета мы дадаткова выявілі 117 новых раней невядомых месцаў масавага знішчэння насельніцтва. Будуць устанаўлівацца не толькі раней невядомыя населеныя пункты, спаленыя фашыстамі, а і прозвішчы карнікаў, імёны тых, каго яны закатавалі і спалілі. Працягваецца работа і з жывымі сведкамі. Звыш 13,5 тысячы мы ўжо дапыталі, яшчэ трэба будзе ажыццявіць допыт у адносінах да не менш чым 300—350 чалавек, у тым ліку ў былых краінах Савецкага Саюза. Завершана работа над першым пакетам дакументаў для адпраўлення службовым асобам замежных дзяржаў, вядзецца падрыхтоўка матэрыялаў, звязаная з пачаткам працэсу аб прызнанні генацыду беларускага народа ў міжнародных інстанцыях».



— Жыхары беларускай зямлі заўсёды на працягу вайны былі на пярэднім краі барацьбы з фашызмам і ўнеслі вельмі важкі ўклад у нашу агульную Перамогу, — падкрэсліў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Барыс ГРЫЗЛОЎ**. — Мы павінны памятаць іх імёны.

Дарэчы, хутка на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу разгорнецца маштабная будоўля, у якой актыўны ўдзел возьме моладзь. У Хатыні з'явіцца новы музей, які пры дапамозе сучасных тэхналогій будзе даносіць праўду аб хатынскай трагедыі, а таксама ў цэлым аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а новага пакалення беларусаў.

**Вераніка КАНЮТА,**
**фота БелТА.**

### ПАДЧАС МІТЫНГУ-РЭКВІЕМУ Ў МЕМАРЫЯЛЬНЫМ КОМПЛЕКСЕ «ХАТЫНЬ» БЫЎ АГУЧАНЫ ЗВАРОТ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ:

«Сёння, 22 сакавіка, — жалобная дата страшнай трагедыі, якая стала сімвалам жорсткіх злачынстваў нацызму. Амаль 80 гадоў аддзяляе нас ад вяснавога дня — апошняга ў жыцці 149 жыхароў беларускай вёскі Хатынь. Мірныя і людзі, якія нікому не пагражалі, якія проста хацелі працаваць на роднай зямлі, гадаваць дзяцей і працягваць гісторыю сваёй краіны, былі жыўцом спаленыя карнікамі, якія прыйшлі знішчыць славянскую цывілізацыю.

Факты, пра якія мы нячаста гаварылі, каб зберагчы душы пасляваенных пакаленняў брацкіх — беларускага, украінскага, рускага — народаў, робяць памяць аб зверскай расправе над безабароннымі старымі, жанчынамі, дзецьмі і немаўлятамі яшчэ больш балючай. Уся дзікасць у тым, што разам з нямецкімі фашыстамі ролю ката ўзяў на сябе 118-ы батальён, які складаўся з украінскіх калабарацыяністаў, што прысягнулі на вернасць агрэсару. Тых самых, чыя крывавая дзейнасць натхняе сучасных неанацыстаў, якія знішчаюць сваіх суграмадзян на паўднёвым усходзе Украіны за іх этнічную прыналежнасць.

Але мы дакладна ведаем, што журботны звон Хатыні адгукаецца болем у сэрцах не толькі беларусаў, але і мільёнаў людзей у свеце, якія глядзяць на праўду той вайны адкрытымі вачамі, разумеюць, што ў нацызму няма нацыянальнасці, і вераць, што зло будзе пакарана.

Спачывайце з мірам, апошнія жыхары тысяч нашых вёсак, спаленых і сцёртых з твару зямлі. Мы будзем рабіць усё, каб захаваць у сучасных і будучых пакаленнях гістарычную памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, аб яе сапраўдных героях — вялікіх сынах і дочках шматнацыянальнага савецкага народа-пераможцы».

# Дастаткова адной іскры

### НЕБЯСПЕЧНЫ ФОРС-МАЖОР

У першы ж дзень вясны ў аграгарадку Падарэссе Старадарожскага раёна мужчына на сваім участку вырашыў спаліць смецце. Дапамагаць яму ўзяўся тавараыш. Не паспелі развесці вогнішча, як навядзенне парадку пайшло не па плане. Раптоўна парывы ветру перакінулі агонь на траву. Не маючы ніякіх сродкаў тушэння, адзін з жыхароў пачаў збіваць агонь нагамі. Зразумеўшы, што самастойна патушыць узгаранне не атрымаецца, патэлефанаваў ратавальнікам. У гэты час агонь ужо перакінуўся на ўчастак суседзяў — пачалі гарэць цюкі з саломай. На шчасце, жыллё і пабудовы не пацярпелі. Абышлося і без ахвяр.

Супрацоўнікам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Чэрвеньскага раёна паведамленне аб узгаранні сухой расліннасці 10 сакавіка паступала двойчы. Спачатку аб тым, што паблізу вёскі Астравы гарыць поле, ратавальнікам паведаміў відавочца. Як высветлілася, мясцовы жыхар наводзіў парадак на сваім агародзе, за якім знаходзіцца калгаснае поле. Менавіта на яго і перакінуўся агонь. Падраздзяленні МНС, якія аператыўна прыбылі, ліквідавалі ўзгаранне. На месцы здарэння таксама працавала тэхніка гаспадаркі: для прадухілення распаўсюджвання агня з дапамогай трактара ажыццяўлялася абворванне.

Літаральна праз гадзіну ратавальнікі Чэрвеньшчыны тушылі пажар каля моста ў гарадскім пасёлку Смілавічы. У ходзе расследавання было ўстаноўлена, што наўмысна там агонь ніхто не паліў. Па папярэдніх прагнозах ратавальнікаў, прычынай узгарання стаў непатушаны недакурак, які нехта выкінуў з акна аўтамабіля — у тым месцы наладжаны інтэнсіўны дарожны рух. Агонь быў аператыўна ліквідаваны.

Днём 19 сакавіка ратавальнікам Гомельскага рэгіёна паступіла паведамленне, што гарыць сухая расліннасць у вёсцы Чыстыя Лужы Веткаўскага раёна. Агнём была знішчана драўляная хата, а таксама пашкоджаны суседнія дамы і гаспадарчыя пабудовы. Акрамя таго, на плошчы ў 10 гектараў згарэла сухая расліннасць з пажнiўнымі рэшткамі: кукуруза, якую чамусьці не паспелі прыбраць восенню, перайтварылася ў вуглі. На шчасце, нягледзячы на маштаб узгарання, абышлося без пацярпелых. Адна з магчымых версій пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас спальвання сухой расліннасці, травы на карані.

Па гэтай жа прычыне, як паведамляюць супрацоўнікі Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, хутчэй за ўсё, адбыўся пажар і за тэрыторыяй нежылога домаўладання ў вёсцы Ямішчы Жлобінскага раёна. У гэтым выпадку — без хэпі-энду: на пажары без прыкмет жыцця знойдзена пенсіянерка, якая з'яўлялася грамадзянкай Украіны.

Супрацоўнікі Ваўкавыскага райаддзела МНС днямі змагаліся з агнём у вёсцы Старыя Хацькоўцы. Жыхар раённага цэнтра прыехаў навесці парадак на лецішчы. Пасля вырашыў, як гэта часта бывае, спаліць смецце. Парыў ветру выбіў з яго рук запаленую паперу, з дапамогай якой ён хацеў развесці вогнішча. За лічаныя секунды ўспыхнула полымя. Агульная плошча пажару склала паўтара гектара. Тушыць пажар ратавальнікам дапамагалі мясцовыя жыхары. На шчасце, абышлося без ахвяр.

### ВОГНІШЧА ПАД КАНТРОЛЕМ

І такіх прыкладаў, калі навядзенне парадку на зямлі заканчваецца пажарам, а ў некаторых выпадках — яшчэ і гібеллю людзей, хапае ў кожным рэгіёне краіны. З году ў год ратавальнікі не перастаюць паўтараць, да чаго можа прывесці спальванне смецця на сваім участку, нагадваюць, як звычайную прыборку на прысядзібнай тэрыторыі не ператварыць у трагедыю. Толькі ці прыслухоўваемся мы да парад спецыялістаў?! Як заўсёды, нам здаецца, што падобнае можа адбыцца з кім заўгодна, толькі не з намі.

Каторы раз ратавальнікі рэкамендуюць пры выбары спосабу ўтылізацыі смецця аддаваць прыярытэт бяспечным. Калі ж вы ўсё-такі вырашылі развесці вогнішча ў сябе на падворку, не забывайцеся падумаць аб тым, як не дапусціць пажару.

Перш чым развесці вогнішча, прадугледзьце, дзе лепш гэта зрабіць. Вызначыўшыся з месцам, уличыце, каб яно знаходзілася на бяспечнай ад будынкаў і збудаванняў адлегласці. Месца для развядзення агню павінна быць ачышчана ад гаручых рэчываў і матэрыялаў, сухой расліннасці. Каб агонь не распаўсюджваўся па сухой траве, вогнішча трэба акапаць. Катэгарычна забараняецца выкарыстоўваць для распальвання гаручыя ці лёгкаўзгаральныя вадкасці.

Спальванне неабходна ажыццяўляць пад пастаянным кантролем. Пад рукой павінны быць першасныя сродкі пажаратушэння: вогнетушыцель або вядро вады і рыдлёўка — у выпадку пазаштатнай сітуацыі гэтыя рэчы дапамогуць папярэдзіць распаўсюджванне агню. Пасля таго, як вогнішча дагарэла, не забудзьцеся вуглі заліць вадой: гэтым вы папярэдзіце паўторнае ўзгаранне. Калі на вуліцы ветранае надвор'е, лепш навядзенне парадку на прысядзібнай тэрыторыі, звязанае са спальваннем смецця, перанесці на іншы дзень.

— Спальванне сухой расліннасці, траў на карані, а таксама ржышча і пажніўных рэшткаў на палях увогуле забаронена, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Трэба разумець, якую небяспеку цягнуць за сабой бяздумныя дзеянні. Ад невялікага вогнішча могуць загарэцца хаты і хлявы, пацярпець або загінуць самі людзі. Акрамя таго, правядзенне палаў часта прыводзіць да ўзгарання тарфянікаў і лясных насаджэнняў. Часта дастаткова адной іскры, каб ваша жыццё і маёмасць аказаліся пад пагрозай.

Ратавальнікі звяртаюцца да грамадзян не праходзіць міма травы, якая гарыць. Пры немагчымасці патушыць пажар сваімі сіламі паведамляйце аб узгаранях у Міністэрства па надзвычайных сітуацыях па нумарах 101 або 112.

**Вераніка КАНЮТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Страта

# Інтэлігент, прафесіянал, светлы чалавек

**Вельмі сумная вестка прыйшла ў рэдакцыю: пайшоў з жыцця памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях — прэс-сакратар, палкоўнік унутранай службы Віталь Уладзіміравіч НАВІЦКІ.**

Не без клопату гэтага светлага чалавека, прафесіянала сваёй справы, на працягу многіх гадоў паміж газетай «Звязда» і Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях наладжана шчыльнае ўзаемадзеянне. Не без увагі Віталя Уладзіміравіча на старонках найстарэйшага рэспубліканскага выдання краіны выходзіў спецыяльны праект рэдакцыі і ведамства «Жывіце ў бяспецы». Прэс-сакратар нярэдка падказваў тэмы для рубрыкі, актыўна выступаў на старонках «Звязды» ў якасці эксперта. Патрэбную інфармацыю даваў заўсёды па сутнасці і аператыўна.

Журналістам вельмі проста і цікава было з ім працаваць. Сам журналіст па адукацыі, Віталь Уладзіміравіч добра разумеў, што ад яго хочуць прадстаўнікі мас-медыя, пагаджаўся на любыя прапановы, звязаныя з падрыхтоўкай эксклюзіўнага інфармацыйнага прадукту. Нярэдка Віталь Навіцкі быў госцем нашай рэдакцыі.

Заўсёды інтэлігентны, просты, шчыры і з усмешкай — такім запомніцца прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Ён пражыў вельмі кароткае жыццё (у пачатку месяца Віталю Навіцкаму споўніўся ўсяго 41 год), але пакінуў аб сабе толькі светлы напамін. Вечная памяць...

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае спачуванні родным і блізкім памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях — прэс-сакратара, палкоўніка ўнутранай службы Віталя Уладзіміравіча НАВІЦКАГА.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім, а таксама калектыву Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь у сувязі са смерцю Віталя Уладзіміравіча НАВІЦКАГА, памочніка міністра па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь — прэс-сакратара, палкоўніка ўнутранай службы.**

# Быць пісьменнікам і грамадзянінам

## Беларускія літаратары на сваім з'ездзе абмеркавалі актуаліі жыцця і творчасці і выбралі новага кіраўніка

**Учора ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся XXV з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі. Падчас юбілейнага форуму ўдзельнікі не толькі абмеркавалі пытанні, звязаныя з сучасным літаратурным працэсам у нашай краіне, але шляхам галасавання абралі новага старшыню саюза. На мерапрыемстве прысутнічала 197 дэлегатаў, якія прадстаўлялі пісьменніцкія суполкі ўсіх абласцей Беларусі. Спікеры форуму выказвалі свае прапановы, звязаныя з папулярызацыяй літаратуры і развіццём грамадскай самасвядомасці.**



**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ** падчас адкрыцця форуму зачытаў зварот кіраўніка краіны да ўдзельнікаў пісьменніцкага з'езда. У ім Прэзідэнт адзначыў, што найлепшыя ўзоры класічных твораў, праўдзівае, натхнёнае слова сучаснага пісьменніка сталі здабыткам культурнай спадчыны Беларусі. «Ідучы ад праўды жыцця, вы сваім талентам і актыўнай пазіцыяй самааддана служыце Радзіме, замацоўваеце пазіцыі беларусаў як высокакультурнай нацыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што з'езд СПБ вызначыць новыя магістральныя шляхі развіцця беларускай літаратуры, будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню высокіх маральных ідэалаў і традыцыйных каштоўнасцяў, якія з'яўляюцца асновай духоўнай бяспекі грамадства.

Ад сябе Ігар Луцкі дадаў, што неабходна шукаць новыя шляхі развіцця літаратуры. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прапанаваў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі ўзяць шэфства над студэнцкімі літаратурнымі аб'яднаннямі, адрадзіць літаратурныя калонкі ў рэгіянальных газетах і часопісах, а таксама больш актыўна інтэграваць сваю творчасць у сацыяльныя сеткі:

— Слова пісьменніка, разумная і цікавая кніга — гэта надзейная апора і важны духоўны складнік грамадства. Менавіта таму Саюз пісьменнікаў Беларусі — перадавы ідэалагічны агрэгат нашай дзяржавы. Мастацтва і літаратура ў прыватнасці здольныя найбольш востра і выразна агаляць сацыяльныя праблемы грамадства, паказваючы шлях вылячэння, прымушаючы звяртаць погляды ўнутр сябе, — адзначыў Ігар Луцкі.

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** нагадаў, што форум адбываецца ў Год гістарычнай памяці, гэта абавязвае літаратараў змагацца ў сваіх творах за гістарычную праўду.

**Мікалай ЧАРГІНЕЦ**, які займаў пасаду **старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі** з 2005 года, звярнуўся да сяброў саюза з просьбай больш не вылучаць яго кандыдатуру:

— Шаноўныя сябры, я гатовы сустракацца з вамі і далей, абмяркоўваць пытанні літаратуры. А зараз прашу падтрымаць маю прапанову — прыняць на маё месца чалавека, які стаяў каля вытокаў нашай арганізацыі, разам з ім мы стваралі гэты саюз. Ён заўсёды быў уважлівы да працы Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У выніку галасавання ўдзельнікаў з'езда **Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»**, заняў пасаду старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі. У якасці падзякі за плённую працу дэлегаты абралі Мікалая Чаргінца на пасаду ганаровага старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі.

— Я ўдзячны за аказаны мне давер узначаліць пісьменніцкую арганізацыю краіны. Першыя словы асабістай павагі Мікалаю Чаргінцу — за вашу дзейнасць, пазіцыю, якая вылілася ў кансалідацыю пісьменніцкай грамадскасці пачынаючы з 2005 года, — сказаў Алесь Карлюкевіч. — Час паказвае, што зараз пісьменнікі як ніколі не толькі інжынеры чалавечых душ, але і салдаты слова. Таксама час патрабуе дадаць эвалюцыйным зменам новыя хуткасці. Сапраўды, не хапае публіцыстыкі. І разам з тым уражваюць прыклады, калі ў літаратуру ўвогуле прыходзяць журналісты грамадска-палітычных медыя. Сёння Саюз пісьменнікаў Беларусі складаецца з прадстаўнікоў розных куткоў краіны — пэўна ж, у Год гістарычнай памяці менавіта рэгіёны стануць генератарам новых творчых мастацкіх ініцыятыў.



**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# XXIX Сустрэнемся каля стэнда з кнігамі!

## Што падрыхтаваў Выдавецкі дом «Звязда» на кніжную выстаўку-кірмаш?

**Каля выставачнага цэнтра «БелЭкспа» па праспекце Пераможцаў сёння віруюць людзі — распачала сваю работу XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Сёлета яна адбываецца пад слоганам «Рака часу Бацькаўшчыны». Айчынным кнігавыдаўцам ёсць што паказаць і землякам, і шматлікім гасцям.**

Сваіх сяброў на выстаўцы-кірмашы збірае і Выдавецкі дом «Звязда». Для наведвальнікаў гэта выдатная магчымасць пазнаёміцца з навінкамі, якія з'явіліся ў 2021 годзе, і зусім новымі кнігамі, якія днямі прыйшлі з друкарні.

Не абмініце на выстаўцы кнігу «Нязломны. Аляксей Талай». Яна выйшла ў рамках дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі». Гэтае выданне, прысвечанае вядомаму грамадскаму і палітычнаму дзеячу, паралімпійскаму чэмпіёну, бізнесмену, матывацыйнаму трэнеру, распавядае пра няпросты і цікавы шлях да поспеху ды сямейнага шчасця (у Аляксея Талая чацвёра дзетак) і ўжо атрымала дастаткова вялікі рэзананс у грамадстве.

Сапраўдныя аматары беларускай культуры не пакінуць без увагі праект «Феномен Валянціна Елізар'ева», які па-новаму раскрывае асобу знакамітага на ўвесь свет беларускага харэографа, — кніга таксама ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда».

Прэзентацыі будуць адбывацца на цэнтральнай і дзіцячай пляцоўках. На стэндзе выдавецтва аўтограф-сесіі правядуць Алесь Бадак, Міхась Пазнякоў, Алена Стэльмах, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Віктар Шніп, Раіса Баравікова і многія іншыя.

Апошнія гады значна вырас попыт на дзіцячую літаратуру. І сёння наша выдавецтва імкнецца не проста задаволіць гэты трэнд, але і спрыяць таму, каб да самых юных чытачоў прыходзіла якасная літаратура, якая ўзбагачае ведамі, выхоўвае, звяртаецца да пачуццяў і паказвае непаўторнасць навакольнага свету. Сярод такіх выданняў — кніга ўжо добра вядомага юным чытачам пісьменніка, мовазнаўцы (як адзначаюць бацькі, дзякуючы такому досведу аўтар даносіць дзецям прыгажосць і мілагучнасць роднай мовы) Міхася Пазнякова «Канцэрт».

У юных аматараў чытання карыстаюцца попытам кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Сёння яны выходзяць у розных дзяржаўных выдавецтвах краіны. Стваральнікі дзіцячай літаратуры стараюцца ўвесці сюды дапоўненую рэальнасць і тыя інавацыі, на якія так адгукаюцца сучасныя чытачы, асабліва тыя, што цікавяцца лічбавымі тэхналогіямі.

На кніжнай выстаўцы можна будзе пазнаёміцца з яшчэ адным дзіцячым аўтарам — Паўлам Гушынцом, у планах Выдавецкага дома «Звязда» выпуск цэлай серыі яго кніг.

Таксама будуць ладзіцца выязныя мерапрыемствы ў Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы і бібліятэках № 14 і № 22.

За мінулы год у Беларусі на 30 працэнтаў павялічылася выданне мастацкай літаратуры. Але, як напярэдадні выстаўкі заўважыў дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч, дасведчанаму чытачу, які выдатна знаёмы з айчыннай класікай і цудоўна разбіраецца ў літаратурным працэсе, яшчэ можа не хапаць добрай сучаснай літаратуры. Для такіх патрабавальных спажыўцоў была распачата адмысловая паэтычная серыя. На кніжнай выстаўцы можна набыць кнігі Алеся Бадака «Уладар ветру» і Віктара Шніпа «Васільковы мёд».

— Мы наўмысна робім гэтыя кнігі не вельмі вялікімі. Яны адлюстроўваюць шырокую палітру творчасці аўтараў, але сюды адабрана самае лепшае, дзякуючы чаму кнігі атрымаліся дастаткова лаканічныя, якасныя і па-мастацку пераканаўчыя, — адзначыў Алесь Карлюкевіч.

Безумоўна, кнігавыдавецтвы працуюць на аўтарытэт нашай краіны і дазваляюць наладжваць міжнародныя зносіны. Так, падчас кніжнай выстаўкі адбудзецца прэзентацыя паэтычнага зборніка сусветна вядомага філосафа, матэматыка, астранома, класіка ўсходняй паэзіі Амара Хаяма ў перакладзе на беларускую мову, якую Выдавецкі дом «Звязда» выдаў пры падтрымцы Пасольства Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь.

XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пражодзіць з 23 да 27 сакавіка. Добрая перспектыва цікава правесці вольны час у будні і выхадныя.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Фестывальнае

# СВЯТА ПАД НАЗВАЙ «M@RT.КАНТАКТ»

**У Магілёў зноў завітаў цёплы і па-вясноваму прыгожы міжнародны маладзёжны тэатральны форум, які на працягу тыдня — з 21 да 27 сакавіка будзе галоўнай культурнай падзеяй горада. У 2020 годзе ён быў адменены з-за каранавіруса, а летась прайшоў у фармаце тыдня беларускіх тэатраў. Гледачы мелі раз змаглі пацешыцца найлепшымі пастаноўкамі беларускіх тэатраў мінулых фестывальных гадоў. Сёлетні юбілейны форум вярнуўся да ранейшага міжнароднага фармату. Першапачаткова меркавалася, што ў ім возьмуць удзел таксама Арменія і Малдова, але ў выніку абставін ён абмежаваўся ўдзелам тэатраў толькі дзвюх краін — Беларусі і Расіі. У яго рамках адбудзецца столькі ж спектакляў, колькі гадоў форуму, — 15.**

У панядзелак імпрэза гучна заявіла пра сябе вулічным перформансам Streat.Art. Падарожжа ў загадкавы свет пад назвай «M@rt.Кантакт» пачалося пад гукі фанфар, залпаў канфеці-пушкі запускам паветраных шароў, якія, нібы птушкі, высока ўзняліся над будынкам драмтэатра. Па чырвонай дарожцы пад апладысменты гараджан у тэатр прайшлі арганізатары, эксперты і непасрэдныя ўдзельнікі форуму.

Са сцэны гледачоў павіншавалі з адметнай тэатральнай падзеяй **першы намеснік міністра культуры Валерый ГРАМАДА**.

— Менавіта на такіх творчых форумах, як «M@rt.Кантакт», мы адкрываем для сябе новыя таленты і ідэі, — адзначыў ён. — Магілёўскі форум ужо мае свае традыцыі, сваіх прыхільнікаў і гледачоў. Цудоўна, што ён, нягледзячы ні на што, працягваецца. На такіх творчых пляцоўках мы зараджаемся пазітывам.

Арганізатары «M@rt.Кантакту» паклапаціліся, каб на гэты раз у афішы было больш спектакляў не столькі авангардных, колькі псіхалагічных.

— Рэпертуар падабраны з такім разлікам, каб абудзіць душу гледача і нагадаць яму пра вечныя ісціны, — кажа **галоўны рэжысёр Таццяна ПАЦАЙ**. — Сёння хочацца не эксперыментаў дзеля эксперыментаў, не авангарду дзеля авангарду, а каб у людзях абудзілася эмпатыя, каб яны спачувалі таму, што адбываецца на сцэне.

Усе пастаноўкі форуму — лаўрэаты і прызёры нацыянальнай тэатральнай прэміі, а таксама прэм'ерныя, якія ўжо атрымалі прызнанне крытыкаў і гледачоў. Апошнім часам маладзёжны тэатральны форум абыходзіўся без журы, цяпер прынята рашэнне яго вярнуць. Экспертнае журы ўзначаліла **актрыса, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Алена БАРЗОВА**.

— Мы захавалі ўсе традыцыі папярэдніх форумаў, — заўважыла **дырэктар тэатра Ірына БЕЛЯКОВА**. — Асноўны брэнд фестывалю — сярэбраную маску — атрымае кожны калектыў, які выйдзе на сцэну. Ну, а тры найлепшыя пастаноўкі атрымаюць залатыя маскі — іх адзначыць экспертнае і маладзёжнае журы, а таксама нашы гледачы, якія прагаласуюць квіткамі. Запланаваны новы конкурс — «Магія моманту». Кожны, хто будзе рабіць фота з фестывалю, зможа ў ім паўдзельнічаць. Пры закрыцці форуму будзе абраны пераможца, які атрымае ўзнагароду.

— Нягледзячы на тыя падзеі, якія сёння адбываюцца ў свеце, мы хочам звярнуць увагу на тое, што так неабходна нам сёння дзеля міру на зямлі, — разважаў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта Валерый МАЛАШКА**. — Мовай тэатра хочацца данесці да гледача тое добрае і вечнае, што заўсёды аб'ядноўвала людзей. Хацелася б, каб форум стаў пляцоўкай, дзе абмяркоўваюць жыццесцвярджальныя моманты. «M@rt.Кантакт» заўсёды быў цікавай дыскусійнай пляцоўкай. Тут вызначалася будучае сцэны не толькі горада, але і краіны. Важна, што разам з вясной мы вяртаемся да тэатральнага жыцця. І гэта дае спадзяванні, што найлепшыя нашы мары спраўдзяцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «НЕАБХОДНА КОЖНЫ ДЗЕНЬ РАБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ І БЫЦЬ КАРЫСНЫМ ЛЮДЗЯМ»

**Самы малады рэктар самага маладога медыцынскага ўніверсітэта краіны Ігар СТОМА з цяжкасцю выдзеліў час для інтэрв'ю. Карыстаючыся магчымасцю зрабіць перапынак і заадно адказаць на пытанні, ён запрасіў у парк каля палаца Румянцавых-Паскевічаў, які знаходзіцца амаль насупраць Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Шпацыруючы ўздоўж берага Сожа, пытаюся, як часта Ігар Алегавіч знаходзіць час для прагулак па жывапісных мясцінах горада?**

— Вельмі рэдка. З задавальненнем рабіў бы гэта часцей, але не магу з-за занятасці сабе дазволіць. Калі выпаў час на інтэрв'ю, лепш прайсціся і падыхаць свежым паветрам.

Я вельмі люблю родны Мінск, але ўжо люблю і Гомель. Да гэтага часу блытаю назвы вуліц, вельмі складана ўяўляю язду на машыне. Да Гомеля адношуся з павагай і любоўю, але назваць сябе экспертам па горадзе пакуль не магу.

***— Тое, што вы будзеце ўрачом, было амаль што прадвызначана: некалькі пакаленняў вашай сям'і займалася лячэннем людзей. Таму крыху недарэчна пытацца пра ваш шлях у прафесію, але чаму пры выбары спецыяльнасці спыніліся менавіта на інфекцыйных хваробах?***

— З выбарам не было ўсё так адназначна. У юнацтве захапляўся і гісторыяй, і замежнымі мовамі, шмат сіл патраціў на іх вывучэнне. Я лічу, што дынастыі, асабліва ў такой высокаінтэлектуальнай, складанай галіне, як медыцына, — гэта добра, хоць і не заўсёды лёгка. З аднаго боку, з дзяцінства бачыш пэўныя заканамернасці развіцця сферы, а з іншага — каму больш дадзена, з таго больш і запытаюць. Так гістарычна склалася ў шматлікіх краінах, што ўрачэбныя дынастыі — вельмі распаўсюджаная з'ява. У маёй сям'і яна пачынаецца з прапрадзеда. Ён быў у першым савецкім выпуску Кіеўскага медыцынскага ўніверсітэта. Гэта былі няпростыя часы — пачатак XX стагоддзя. Прапрадзед фельчарам прайшоў Грамадзянскую вайну, удзельнічаў у Вялікай Айчыннай і завяршаў свой працоўны шлях у Батумі. Я скончыў вучобу ў Мінскім медуніверсітэце як хірург па спецыяльнасці «хірургічныя хваробы». Яшчэ на першых курсах мяне вельмі цікавіў навуковы кампанент спецыяльнасцяў. Спрагназаваўшы з дапамогай старэйшых калег, я вызначыў, што ўсе найбольш важныя падзеі XXI стагоддзя будуць адбывацца ў галіне інфекцыйных хвароб. Як бачыце, прагнозы праз гады спраўдзіліся. Я не змяніў сваё меркаванне, што «інфекцыйныя хваробы» — адна з самых цікавых спецыяльнасцяў у медыцыне. Як інфекцыяніст, гляджу на хваробу не на ўзроўні аднаго пацыента, а бачу сітуацыю з пазіцыі насельніцтва, дзясяткаў і соцень тысяч хворых людзей.

***— Ад агульнага да асобнага: можна казаць, што наша краіна ўжо пераадолела пандэмію каранавіруса? Ці будуць яшчэ эпідэміі, якія могуць пагражаць чалавецтву?***

— Я бы ўвогуле з пункту гледжання інфекцыйных хвароб хацеў бы перасцерагчы: пакуль існуе чалавецтва, яго будуць суправаджаць інфекцыі і эпідэміі. Таму расслабляцца не трэба. Дасведчаныя кіраўнікі будуць у першую чаргу укладваць сродкі ў механізмы барацьбы з эпідэміямі, працаваць на папярэджанне іх наступстваў. Сказаць, што ўсё закончылася і больш такога ніколі не будзе, — няправільна. Не будзе каранавіруса, будзе іншы вірус. Нагадаю, што эпідэміі адбываюцца рэгулярна. Той жа грып нікуды не сышоў і будзе прысутнічаць у чалавечай папуляцыі. Успомніце: ліхаманкі Эбола, Зіка — рэгулярна адбываюцца нейкія інфекцыйныя пагрозы для чалавецтва. Калі адказваць на ваша пытанне, ці будуць яшчэ эпідэміі, скажу: «Так». Чым яны будуць выкліканыя, не ведаю.

***— Наша краіна на вопыце пандэміі навучылася прыстасоўваць сваю сістэму аховы здароўя да эпідэмій?***

— Адным з моцных бакоў сістэмы аховы здароўя нашай краіны з'яўляецца тое, што ў нас захавалася самае лепшае з сістэмы аховы здароўя Сямашкі. Яна мела ў сабе вялікі прафілактычны кампанент — санэпідслужбы, інфекцыйныя бальніцы. У шэрагу замежных краін, дарэчы, няма паняцця «інфекцыйная бальніца». Ёсць шматпрофільная бальніца, дзе прысутнічае адпаведнае аддзяленне. У нас жа захавалася разгалінаваныя сеткі інфекцыйных бальніц, якія маюць дастаткова ложкавы фонд, спецыялістаў гэтай галіны. Ёсць добры выраз у адносінах да любых эпідэмій: любая эпідэмія заканчваецца — гэта біялагічны закон. Як толькі мікраарганізмы захопліваюць новыя арэалы жыхарства, яны вычэрпваюцца і згасаюць самі сабой. Іншае пытанне, якой цаной яны заканчваюцца. Калі пры эпідэміі ў горадзе памірае 2/3 жыхароў, яна закончыцца, але цана — смерць вялікай колькасці людзей.

***— Але заканчваюцца эпідэміі і з-за набыцця імунітэту?***

— За кошт фарміравання імуннай праслойкі. Нават у выпадку асабліва небяспечных інфекцый паміраюць не ўсе. Ад чумы таксама паміралі не ўсе захварэлыя, нават пры адсутнасці нейкага лячэння. Частка людзей гіне, але частка і выздараўлівае, атрымлівае імунітэт да хваробы.

**«Пазіцыя рэктара — не ўзнагарода, а складаная штодзённая работа».**

***— Вы перахварэлі на ковід?***

— Яшчэ ў пачатку пандэміі. Пасля я не адзін раз прышчапляўся. Перанёс хваробу сярэдняй цяжкасці. У мяне было пашкоджанне лёгкіх. Падкрэслю, што перахварэў я тады, калі яшчэ не было вакцын як механізма аховы ад інфекцый.

***— Якраз пра вакцыны... Шмат было размоў пра іх у грамадстве. Вы сцвярджаеце, што вакцынацыю ад ковіду неабходна працягваць?***

— Абавязкова. Падыходы да вакцынацыі ў цэлым (я зараз не толькі пра ковід кажу) — гэта як падыходы да ўласнай гігіены. Ці неабходна чысціць зубы раніцай? Гэта хтосьці яшчэ абмяркоўвае? Верагодна, не. Таму і адносіны да вакцынацыі дасведчанага, адукаванага чалавека павінна быць як да базавых пытанняў клопату пра сябе. Нармальны чалавек павінен праходзіць дыспансерызацыю, перыядычна ацэньваць параметры свайго арганізма, рабіць прышчэпкі для сваіх дзяцей і для сябе, каб засцерагчы ад інфекцый. У сённяшняй сітуацыі з ковідам неабходна зрабіць прышчэпку, калі яшчэ не рабілі. Нават калі вы перахварэлі, ідзіце па прышчэпку. Так, сёння ёсць зніжэнне захваральнасці, але ў мяне няма ўпэўненасці, што адбудзецца праз паўтара-два месяцы.



***— У вас быў значны вопыт удзелу ў замежных стажыроўках. Відавочна, што вы параўноўвалі сістэму аховы здароўя ў нашай краіне і ў заходніх дзяржавах. Як вы можаце ацаніць нашу медыцыну?***

— У цэлым, у нас дастаткова эфектыўная сістэма аховы здароўя. Самае лепшае, што было ў Савецкім Саюзе, засталося, але дадаліся сучасныя тэхналогіі. Вельмі важная ўвага з боку дзяржавы накіравана на ахову здароўя. Больш за тое, як рэакцыя на пандэмію, дзяржава аказала яшчэ большую падтрымку фінансавую, арганізацыйную. На мой погляд, сёння неабходна не забываць пра тыя ўрокі, якія мы вынеслі з пандэміі. Часта ў адносінах да інфекцыйных захворванняў адбываецца расслабленасць у міжпандэмійны перыяд. Я не хацеў бы, каб у гэты час забываліся пра падтрымку навукі, лабараторый, сістэму інфекцыйных клінік. Каб быць гатовымі да пагроз, неабходна рыхтавацца не ў час небяспекі, а загадзя.

***— Давайце пагаворым пра вашу сённяшнюю асноўную справу — работу ў ВНУ. Вы сам малады чалавек. Удаецца знаходзіць агульную мову са студэнцкай супольнасцю?***

— Увогуле пытанне ўзросту вельмі цікавае. Пакаленне — гэта не ўпоперак, а ўздоўж. Можна знайсці блізкага табе чалавека па поглядах, які будзе значна старэйшы ці малодшы за цябе. А можна не мець агульных пунктаў перасячэння з аднагодкамі. З моладдзю неабходна ўзаемадзейнічаць. Як казаў Маа Цзэдун: «Каб плаваць, неабходна плаваць». Каб мець зносіны з моладдзю, неабходна мець зносіны з моладдзю. Мне цяжка сказаць, што ўзрост дзесьці дапамагае ці перашкаджае. Калі я прыйшоў па пасаду рэктара, удзяліў значную ўвагу маладзёжнай навуцы. Я паказаў, што тыя, хто займаецца навукай, атрымліваюць поўную падтрымку рэктара, які сам са студэнцкіх гадоў ёй займаўся. Лічу, што гэта правільна.

Часам манітору, як ідуць заняткі ў выкладчыкаў, якім за 70 гадоў. Я бачу, наколькі жвавыя яны, наколькі здольныя зацікавіць моладзь. Бывае, сустракаеш чалавека гадоў 25, а ён абсалютна пусты, незацікаўлены нічым, з нейкімі нігілістычнымі поглядамі на свет.

Дарэчы, памятаеце раман Тургенева «Бацькі і дзеці»? Герой Базараў памёр ад сыпнога тыфу. На гэтым увесь нігілізм скончыўся. Інфекцыі не разбіраюць, хто ў што верыць, не падзяляюць нашых поглядаў, рэлігій, палітычных пераваг. Мікробам усё роўна, за каго мы галасавалі і якое тэлебачанне глядзім, яны абсалютна аднолькава адносяцца да ўсіх.

***— З гэтай нагоды ў мяне пытанне. Ёсць такое меркаванне, што людзі ў залежнасці ад характару маюць тыя ці іншыя дыягназы. Як вы лічыце, псіхалогія чалавека ўплывае на яго здароўе?***

— Што датычыцца інфекцыйных хвароб, то няма даказаных даных, нібыта настрой чалавека ўплывае на ход хвароб. Больш за тое, калі ў мяне пытаюць, як падтрымаць імунітэт, я адказваю, што спецыфічных імунастымулятараў няма. Пры ўсёй маёй павазе да аптэчных сетак, тое, што прадаецца пад назвай «павысіць ваш імунітэт», — гэта недаказаныя рэчы. З боку неспецыфічнай стымуляцыі імунітэту: пазітыўны чалавек з добрым настроем, які часцей усміхаецца, мае вышэйшымі некаторыя паказчыкі імунітэту.




**Рэктар з валанцёрамі, якія працавалі з ковід-пацыентамі.**

**Прынцып па жыцці: «Рабі людзям добра».**

***— Чаго хаваць, у нашага насельніцтва вельмі скептычныя погляды на ўрачоў, асабліва адносна тых, што працуюць у раённых паліклініках. Вы выхоўваеце маладых спецыялістаў, таму да вас пытанне: якімі якасцямі павінен валодаць сучасны медык, каб быць аўтарытэтным і прафесіянальным?***

— Адзначу такое паняцце як эмацыянальны інтэлект — калі чалавек кампетэнтны не толькі ў пэўнай галіне, але і ў стане эфектыўна ўзаемадзейнічаць з людзьмі. Мы і рыхтуем моладзь, каб яна больш цярпліва адносілася да пацыентаў. Але неабходна разумець, што студэнты медыцынскіх ВНУ — гэта не жыхары іншай планеты, яны адлюстроўваюць наша грамадства. Тыя праблемы, што ёсць у грамадстве, будуць сустракацца і ў медсупольнасці.

***— Якія ўменні неабходныя сучаснай моладзі?***

— Я лічу, што маладым людзям неабходна больш чытаць. Сёння рэдкасць — сустрэць кагосьці сярод моладзі з кнігай. Падчас прагляду кінафільма задзейнічана значна менш зон галаўнога мозга, чым пры чытанні. Калі чытаеш кнігу, прыходзіцца самому ўяўляць карціну ў галаве. Я чытаю і навуковую, і мастацкую літаратуру. Не лічу правільным, калі чалавек ізалявана вывучае толькі сваю прафесію. Урач як інтэлігент павінен цікавіцца і мастацтвам, і літаратурай, і тэатрам. Люблю рускую літаратуру: Антона Чэхава, Міхаіла Булгакава, Аляксандра Пушкіна — іх можна перачытваць бясконца ў залежнасці ад узросту. З беларускіх аўтараў любімы — Уладзімір Караткевіч. Для расслаблення чытаю Яраслава Гашэка. З замежных падабаецца яшчэ Эрнэст Хемінгуэй, Джон Стэйнбэк, Джэк Лондан.

***— Як вы ставіцеся да фільмаў пра медыкаў? У якой стужцы больш дакладна паказана работа ўрачоў?***

— Мне ўспамінаецца чорна-белы фільм савецкіх часоў «Калегі». Там паказана сяброўства трох маладых людзей, выпускнікоў Ленінградскага медуніверсітэта, іх станаўленне ў прафесіі. Шматлікія фільмы савецкага часу маюць долю рамантызму і добрай наіўнасці, чаго не хапае сучаснаму кінамастацтву. Я не гляджу серыялы, люблю поўны метр. «Доктара Хауса» некалькі серый паглядзеў — гэта дастаткова дакладна зробленае кіно. Відавочна, у іх былі добрыя медыкі-кансультанты.

***— Медыцына — гэта сфера, дзе працуюць толькі энтузіясты? Ці магчыма ўрачу добра зарабляць?***

— Чаму доктар павінен быць бяссрэбранікам? Не разумею гэтага стэрэатыпу. Сур'ёзная работа павінна адпаведным чынам і ацэньвацца. Я лічу, што ў медыцыне можна добра зарабляць. Але гэта прыходзіць з цягам часу, з вопытам, з кваліфікацыяй. У любой краіне свету прафесійны ўрач будзе запатрабаваны і зможа забяспечыць добрае жыццё сабе і сваёй сям'і.

***— Ці займаецеся вы цяпер урачэбнай практыкай?***

— Я ў першую чаргу ўрач, а ўжо затым арганізатар, кіраўнік. Я быў урачом і ім застаюся. У мяне атрымліваецца аказваць меддапамогу, браў удзел у лячэнні найбольш складаных ковід-пацыентаў.

***— Якія мэты ў вас на далейшае жыццё?***

— Рабі, што павінен, і што будзе, тое будзе. Неабходна кожны дзень рабіць сваю справу і быць карысным людзям. Прафесія ў мяне вельмі добрая. Яна становіцца ўсё больш запатрабаванай. У нашай прафесіі можна працаваць усё жыццё, каб рабіць людзям добра.

***— Вы вельмі скептычна ставіцеся да афішыравання свайго ўзросту. Чаму не любіце падкрэсліваць свой малады ўзрост як перавагу?***

— Я не люблю ўвогуле падкрэсліваць свае перавагі. Добрыя мае якасці ацэняць людзі, слабыя я ведаю сам. Мне нічога нечакана і неабгрунтавана не звалілася з неба. Я прайшоў шлях, неабходны для кіраўніка ВНУ. Проста хтосьці гэта робіць крыху даўжэй, а нехта хутчэй. Зноў жа: каму многае дадзена, з таго многае і запытаюць. Пазіцыя рэктара — не ўзнагарода, а складаная штодзённая работа.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Ад прадзедаў

# «СУНІЧКА» — ТОЕ, ШТО ТРЭБА...

**Любоў да Радзімы пачынаецца з любові да сям'і і школы, з ведання сваіх мовы, гісторыі, народных традыцый. Папулярызацыяй іх на нашай Лунінеччыне займаюцца ўдзельнікі фальклорнага ансамбля «Сунічка».**



Кіраўнікі яго Уладзімір і Людміла Калянковічы — дасведчаныя педагогі і вялікія майстры сваёй справы, якія ўмеюць працаваць не толькі з дзецьмі. Дзякуючы зносінам з іх бацькамі ладзяцца адмысловыя экспедыцыі па зборы этнаграфічных матэрыялаў, цікавыя сустрэчы з носьбітамі нацыянальных традыцый, з выбітнымі землякамі. У выніку юным выхаванцам перадаецца шчырае захапленне фальклорам: яны з задавальненнем спяваюць народныя песні, выконваюць танцы, паказваюць мясцовыя абрады падчас святкавання Каляд, Купалля, гукання вясны.

Удзельнікі ансамбля «Сунічка» — вучні таленавітыя. Сваё майстэрства яны не раз дэманстравалі падчас правядзення школьных і раённых мерапрыемстваў, перамагалі на раённым этапе абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва «Радавод».

...На жаль, носьбітаў даўніх традыцый з кожным годам застаецца ўсё менш і менш. А значыць, трэба (пакуль не позна) вывучаць і прапагандаваць усё, што стварылі нашы продкі, бо гэта — наша спадчына, наша жыццё.

**Таццяна Насковіч,**
*г. Лунінец.*

На чужых памылках

# На смачны кусок знойдзецца раток

**Любка — добрая гаспадыня, гатуе — пальчыкі абліжаш! І заўжды ў яе першае, другое, салата, кампот... Муж да гэтага адразу прывык і нават вырашыў, што вось так — правільна — будзе харчавацца заўжды, што б там ні здарылася!**

Накаркаў: жонка ўзяла ды ў госці з'ехала, сказала, на пару дзён...

Коля ўзяўся кулінарыць: палічыў, што да супу і катлет, прыгатаваных Любай яшчэ перад ад'ездам, добра было б зрабіць вітамінную салату. Для гэтага ён зварыў яек, наскуб у гародзе маладога шчаўя і зялёнай цыбулі, а нарэшце ўбачыў, як дружна ўзнялося пер'е часнаку. «Можна трохі зрэзаць», — падумаў ён і разагнаўся аж на цэлы радок.

Салаты і сапраўды атрымалася шмат. І на смак яна была вельмі нішто сабе! Праўда, часнок зусім не адчуваўся, але ж такой бяды. Кухар добра пад'еў і пра свой эксперымент назаўтра, можа, не ўспомніў, калі б з гасцей не вярнулася Любачка, калі б, зазірнуўшы ў гарод, не завойкала: «А што ж гэта робіцца?! А які ж гэта дурань мае нарцысы пазразаў? Яны ж нават пупышак выкінуць не паспелі!»

«Дурань» вінавата шмыгнуў носам, але змаўчаў. Падумаў толькі, што добра есці смачнае ды гатовае, а вось тое, што сам згатаваў, можа, і не заўжды.

**А. Навасельская,**
*Докшыцкі раён.*

На здароўе!

# «Фортку адчыніць прасцей»

**Неяк пачуў размову дзвюх суседак. Адна з іх — вельмі пажылая — скардзілася на тое, што досыць часта баліць галава, павышаецца ціск, з'яўляецца слабасць... А потым выпадкова ўбачыў, што кватэру яна «падаграве» з дапамогай... кухоннай газавай пліты.**

Прыйшлося нагадаць жанчыне, што пры згаранні прыроднага газу ў паветры з'яўляюцца шкодныя рэчывы: фармальдэгід, бензол, ксілол, серавадарод, што кватэру ва ўсе поры года трэба тры-чатыры разы на дзень праветрываць скразняком. Калі гэтага не рабіць, у людзей, асабліва пажылых і дзяцей, сапраўды могуць узнікаць розныя захворванні, якія выяўляюцца млоснасцю, галаўным болем, ацёкам лёгкіх, кашлем, слабасцю, парушэннем кровазвароту... Ды што там — час ад часу ў СМІ з'яўляюцца паведамленні аб тым, што людзі, атруціўшыся прадуктамі гарэння газу, нават паміраюць...

Чалавеку трэба дыхаць чыстым паветрам, а для гэтага добра было б праветрываць яшчэ і пад'езды. Ну сапраўды: людзей па лесвіцах падымаецца і спускаецца шмат. Сярод іх (асабліва падчас эпідэмій) ці не заўсёды сустракаюцца хворыя на грып, каранавірус, бранхіт, пнеўманію, дызентэрыю і г. д. Застаялае, насычанае мікробамі паветра становіцца сапраўдным рассаднікам хвароб, якія жыхары «падбіраюць», «пераймаюць» адзін ад аднаго, разносяць па сваіх сем'ях і працоўных калектывах. Спрыяе гэтаму і вентыляцыя, з дапамогай якой у нашы кватэры трапляюць не толькі шкодныя для здароўя вірусы, але і тытунёвы дым, угарны газ, пахі ад чужой мэблі, рамонтных работ...

Яшчэ Гіпакрат казаў: «Не хварэюць там, дзе чыста». А значыць, зрабіце высновы: фортку ж і сапраўды адчыніць прасцей?

І хваробу папярэдзіць лягчэй, чым потым лячыць.

**Аляксандр Васільеў,**
*г. Віцебск.*

Людзі і лёсы

# «СКРЫПКУ МНЕ САМ БОГ ПАСЛАЎ... НА ВЫРАТАВАННЕ»

**...Немец — яшчэ той, з Першай сусветнай — імкліва наступаў, вяскоўцы ўцякалі спехам: запрагалі валоў, скідвалі ў вазы хоць нешта з нажытку — ехалі да чыгункі. А ўжо адтуль цягнікі мчалі іх у далёкую Тамбоўскую губерню.**

Працавалі тыя «наезджыя» не складаючы рук і неяк жылі, прычакалі рэвалюцыі, а салдатка Фядора — з фронту свайго чалавека. Разам з іншымі ўсё часцей яны сталі ўспамінаць сваю родную вёску і збірацца дахаты.

Цягніком даехалі да Баранавіч. Змучаныя доўгай дарогай, размясціліся там хто дзе мог: на траве, пад дрэвамі... Даставалі з торбаў ежу, радаваліся, што пад нагамі ўжо свая, беларуская зямля...

Вецер узняўся зусім нечакана, прыгнаў аднекуль чорную хмару, маланкі сталі паласаваць неба. Каб схавацца ад дажджу, ад залевы, людзі кінуліся пад цягнік. Што здарылася потым, чаму яго вагоны раптам крануліся, не зразумеў ніхто. «Сынок, на ручкі!» — крыкнуў бацька шасцігадоваму Сеньку. Той паслухаў, памкнуўся на голас, ручкамі ўхапіўся ў бацькаву адзежу — ножкі засталіся пад... коламі цягніка.

Нема загаласіла Фядора. Жанчыны не ведалі, як яе суцяшаць. Мужчыны са скалечаным цельцам на руках ужо беглі ў мясцовую бальніцу.

Маці потым колькі жыла, столькі малілася за тамтэйшага доктара, які змог, вярнуў-такі да жыцця іх сынка, іх адзіную з мужам радасць.

...Сказаць, што ім цяжка потым прыйшлося, — тое ж, што прамаўчаць: елі часам адны бульбяныя лупіны, з горам папалам ляпілі хацінку.

Хіба летам было лягчэй: за паўвярсты ад іхняй сялібы пачынаўся лес. Сенька, як той клубочак, каціўся туды, розных ягад наядаўся сам і бацькам яшчэ прыносіў — у баначцы, што трымаў у зубах. Ці ў торбачцы — грыбоў і арэхаў. Хоць вось гэтак, але і ён дапамагаў сям'і выжываць, прывыкаў працаваць. Сіла з ног пераходзіла ў рукі.



Сын дзеда Шута — Сцяпан Сямёнавіч Хурсін — са скрыпкай-выратавальніцай.

...Адкуль у збалелай душы малога з'явілася музыка, ведае толькі Бог. Прыснілася хлопцу скрыпка, чуў, як жа хораша грае!

Купляць інструмент не было за што — Сенька нават не заікаўся аб гэтым. Думаў, праўда, што змайструе сам, — спрабаваў... Бацька ўбачыў яго пакуты і недзе праз месяц прывёз скрыпку. Яна была цудам, святам, самой таямніцай! Рукі Сямёна тулілі яе да сэрца, душа вадзіла смычком...

Музыканты на сяле — сапраўдная раскоша! Моладзь садзіла Сямёна на санкі, прывозіла на вячоркі. Хлопцы і дзяўчаты лічыліся з ім як з роўным, часам стараліся заплаціць ці аддзячыць (нават кавалкам сала!), і музыка ўсё часцей адмаўляўся ад падвозу. Разам з моладдзю, памалу, на кульцях у галёшах, хадзіў па вуліцах — іграў, будзіў наваколле скрыпкай. Дзяўчаты спявалі.

Асобныя з іх хлопцу падабаліся, але ж ён без ног — як да якой падступіцца?

Ён думаў, баяўся, а лёс ужо сам пасылаў яму шчасце. Ганна — добрая, ціхая, працавітая — усё часцей заставалася побач з Сямёнам: прамакала спатнелы твар, падавала ў кубку вады. На гэта ніхто не звяртаў увагі, бо дапамагчы музыку стараліся многія...

У той вечар з танцаў вярталіся разам. Моладзь не спяшалася: свае крокі як магла «раўняла» з крокамі музыканта, час ад часу нехта адставаў, збочваў дадому...

Калі Ганна з Сямёнам засталіся ўдваіх, скрыпка змоўкла: нібы стала чакаць нечага вялікага і таемнага, што загаралася ў сэрцах сапраўдным каханнем.

...Пабраліся маладыя ўвосень. Акруга, вядома ж, пашумела, паздзіўлялася: ну як гэта за такога калеку замуж пайсці? Ды людзі не маглі не бачыць, што Сямён хіба араць не можа (з гэтым выручала радня ды суседзі), а астатняе ці не ўсё! Залатыя рукі ў хлопца: хочаш — граблі змайструе, хочаш — калаўрот... І касіў ён так, што здаровыя зайздросцілі. Казаў яшчэ: «Мы з Ганнай не адно сваё лета ў стагі паклалі». Шуткаваць таксама любіў трапна, па-вясковаму ёмка. Мабыць, таму і мянушку займеў Шут...

Ён не крыўдаваў, можа, нават радаваўся ёй, бо хоць і цяжка жыў, але весела: у акрузе без яго ды ягонай скрыпкі ні адна бяседа не прайшла!

І дзеці нараджаліся — падмога расла на радасць бацькам.

Ішло жыццё. Старэў Сямён, але скрыпку не кідаў: лашчыў спрацаванымі рукамі, гарнуў да сэрца і не раз казаў: «Мне яе сам Бог паслаў — на выратаванне»

...Спытай цяпер, хто такі Сямён Піліпавіч Хурсін, у вёсцы мала хто скажа. А вось на дзеда Шута людзі не забыліся: абавязкова згадаюць: «А-а-а, гэта той, што без ног і на скрыпцы іграў?».

Так, гэта той.

Хутка, на жаль, прабег яго час: на 85-годдзе свайго такога нялёгкага жыцця перабраўся ён на вясковыя клады. Скрыпку пакінуў сыну.

Ён, Сцяпан Сямёнавіч Хурсін, таксама прысвяціў жыццё роднай вёсцы: працаваў трактарыстам, апошнім часам, на жаль, страціў зрок, пасля смерці жонкі пераехаў да сына з нявесткай. Там у яго асобны ўтульны пакой, дзе для зручнасці зроблена ўсё: Сцяпан Сямёнавіч, каб лішні раз нікога не турбаваць, сам навобмацак, навучыўся выходзіць на вуліцу, гуляць па падворку.

А скрыпка — вартаўніца сямейнай памяці — пакуль што ляжыць у шафе: нікому з дзяцей дзеда Шута, нікому з унукаў талент музыканта пакуль не перадаўся. Адзінае — вакол інструмента апошнім часам усё болей круціцца шчабятуха-праўнучка. З дазволу дзеда яна кратае пальчыкам струны, і сям'і тады хочацца верыць, што наступіць час, і Шутава скрыпка ажыве і яшчэ зайграе.

**Ніна Дрык,**
*в. Балоты, Кобрынскі раён.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

23 сакавіка 2022 г. № 11 (647)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


КОНКУРС

# ДВОР А–ЛЯ МІНЬЁН

## У Гомелі абралі найлепшы камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання








Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.

**АКТЫЎНЫЯ камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — сёння ўжо «фішка» многіх раёнаў Гомеля. Ініцыятывы «гаспадароў» і ў доме, і ў двары, як вялікія сем'і растуць і развіваюцца. Самыя яркія з іх традыцыйна заахвочвае Гомельскі гарадскі Савет дэпутатаў. Хто па выніках мінулага года прэтэндуе на званне найлепшых, высветлілі падчас агляду двароў, добраўпарадкаваных сіламі гомельскіх актывістаў.**

### «Крыштальныя» гаспадары і ў хаце, і ў двары

У «хітпарадзе» дваровых ініцыятыў — традыцыйна камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Крышталь». Яго прапіска — мікрараён актыўнай жыллёвай забудовы Хутар. Ініцыятыва аб'ядноўвае ў адну каманду жыхароў шматпавярховікаў па вуліцы Беліцкай і курыруе дзейнасць па добраўпарадкаванні адразу некалькіх дваровых тэрыторый.

Калісьці каля новабудоўляў па вуліцы Беліцкай быў суцэльны пясок. Забудоўшчык свае абавязацельствы па добраўпарадкаванні выканаў мінімальна. Жыхароў дамоў гэта не задаволіла. Яны талакой стварылі некалькі зручных зон адпачынку для жыхароў розных узростаў і інтарэсаў.

Камітэт самакіравання «Крышталь», які ўзначальвае Аляксандр Сычоў, у конкурсах на найлепшую арганізацыю работы ўжо займаў першае месца ў Гомелі і трэцяе ў вобласці. За мінулы год грамадскае фарміраванне таксама без справы не сядзела.

— У нас у Viber ёсць свой чат, дзе абмяркоўваем, што можам сумесна зрабіць, каб згуртаваць жыхароў, — адзначыў суразмоўнік. — Імкнёмся падтрымаць тых, хто трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю. Не менш важная задача — заняць карысным справай дзяцей, каб не праседжвалі гадзінамі ў гаджэтах, а фізічна развіваліся. Для гэтага рэстаўрыравалі ўстаноўленыя пры засяленні ў дамы арэлі і альтанкі, падрыхтавалі пляцоўку для заняткаў футболам, уладкавалі ў двары спартыўны гарадок.

Адна з самых буйных акцый, якая летась аб'яднала больш за сто актывістаў камітэта, — гэта паліў у спякотнае надвор'е маладых зялёных насаджэнняў у дварах. Літаральна кожнае дрэва з агульнай згоды кааператыва замацавана за кватэрамі. У выніку ў дварах КТГС «Крышталь» прыжылося больш за 90 працэнтаў пасаджаных маладых дрэў.

— Камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання павінен бесперапынна развівацца, — упэўнены кіраўнік КТГС «Крышталь». — І ў нас ёсць планы на найбліжэйшы час. Найперш уладкаваць зону з трэнажорамі для падлеткаў, акультурыць тэрыторыю каля возера, што знаходзіцца побач з нашым мікрараёнам. У планах — зрабіць домік для качачак, якія плаваюць тут. Усталюем лаўкі, каб каля вады маглі адпачываць жыхары мікрараёна.

### «Гарадок міньёнаў»

У дварах дамоў №№ 63, 65, 67 і 71 на Рэчыцкім праспекце Гомеля за дваровымі парадкамі сочаць... міньёны. Адметныя мультперсанажы зроблены з падручных матэрыялаў.

— Гэты двор уваходзіць у склад КТГС «Рэчыцкі». Падчас яго пераўтварэння актывісты натхніліся прыкладам суседняй дваровай тэрыторыі «Праспект цудаў». Таксама вырашылі ўключыць у яго афармленне казачныя элементы. У двары шмат архітэктурных формаў, лодка са сцягам, пляцоўка для самых маленькіх, — кажа **намеснік дырэктара КЖРЭУП «Савецкае» Кірыл ВАЛАСАЧ.**

стар. 10

ВІНШАВАННЕ

## Мінскаму гарадскому Савету дэпутатаў — 105 гадоў

### З гэтай нагоды дэпутацкі корпус сталіцы павіншавала Наталля КАЧАНАВА

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску ад імя верхняй палаты парламента і сябе асабіста павіншавала старшыню Мінгарсавета Андрэя Бугрова, дэпутатаў усіх скліканняў і работнікаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў са 105-годдзем з дня яго заснавання.**

— Гэтая дата — добрая нагода падвесці вынікі, ацаніць праведзеную работу і вызначыць мэты, на дасягненне якіх павінна быць арыентавана дзейнасць Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў у далейшым, — гаворыцца ў віншаванні.

Спікер верхняй палаты парламента адзначае, што многае зроблена для стабільнага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Мінска, які стаў сучасным камфортным мегаполісам, і для павышэння якасці жыцця гараджан.

— Сёння, захоўваючы найлепшыя традыцыі сваіх папярэднікаў, вы працягваеце вырашаць найважнейшыя задачы, якія стаяць перад сталіцай нашай краіны. Гэта патрабуе ад вас глыбокага разумення праблем, якія хвалююць насельніцтва, умення выпрацоўваць неабходныя падыходы, павышанай увагі да тых, хто ў ёй асабліва мае патрэбу: шматдзетныя сем'і, інваліды, пажылыя людзі, — акцэнтуецца ўвага ў дакуменце.

Асаблівую падзяку Старшыня Савета Рэспублікі адрасуе ветэранам.

— Вы стаялі каля вытокаў фарміравання Савета, добрасумленна, з поўнай аддачай працавалі на карысць роднага горада і яго жыхароў, — падкрэслівае Наталля Качанава.

Яна перакананая: найвышэйшая асабістая адказнасць, ініцыятыўнасць, кампетэнтнасць і надалей будуць залогам эфектыўнай, якаснай дзейнасці Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

— Няхай справа, якой вы аддаяце душэўныя сілы, вопыт і веды, прыносіць радасць і жаданне новых прафесійных здзяйсненняў, — акцэнтуе яна і ад усёй душы жадае дэпутацкаму корпусу сталіцы моцнага здароўя, стабільнасці, дабрабыту і новых дасягненняў.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

## Работа на перспектыву

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ аб рабоце па зменах заканадаўства пасля прыняцця абноўленай Канстытуцыі:**

— Не сакрэт, што прынятыя змены і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь сфарміравалі рабочы парадак дня для парламентарыяў на найбліжэйшую перспектыву, — кажа яна і нагадвае, што ў Асноўным Законе традыцыйна вызначаюцца толькі базавыя арыенціры развіцця і каштоўнасныя ўстаноўкі, якія павінны атрымаць належнае прававое афармленне ў адпаведных заканадаўчых актах.

Па словах сенатара, неабходна таксама канкрэтызаваць механізмы рэалізацыі такіх установак.

— Усю вертыкаль улады чакае напружаная праца па ўдасканаленні цэлых блокаў заканадаўства: палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага, — адзначае Таццяна Рунец. У якасці прыкладу ў палітычным блоку звяртае ўвагу на неабходнасць карэкціроўкі Выбарчага кодэкса, змяненне законаў аб Нацыянальным сходзе і Савеце Міністраў, удакладненне функцыяналу органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

Старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі больш падрабязна спынілася на эканамічным блоку:

— Так, фінансава-эканамічны раздзел Канстытуцыі не зведаў істотных змен. Разам з тым нам трэба будзе адкарэкціраваць не адзін дзясятак законаў і ў эканамічнай сферы. Гаворка ідзе аб змене Банкаўскага, Бюджэтнага і Падатковага кодэксаў, інвестыцыйнага заканадаўства. Прычым выконваць гэтую работу мэтазгодна ў цеснай увязцы з далейшай гарманізацыяй эканамічнага заканадаўства ў рамках 28 саюзных праграм, накіраваных на ўмацаванне інтэграцыі Беларусі і Расіі, а таксама з улікам бягучых падзей на знешнім контуры і фактару санкцый.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

# Работа з людзьмі — як экспертная ацэнка заканадаўства

**Нарада па праблемных пытаннях будаўніцтва жылля для шматдзетных прайшла ў Савеце Рэспублікі.**

На пашыраную нараду, якую правёў на мінулым тыдні **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ,** былі запрошаны прадстаўнікі Мінгарвыканкама і зацікаўленых міністэрстваў.

Нагода для такога маштабнага разгляду — калектыўны зварот грамадзян па пытанні вылучэння шматдзетным сем'ям субсідый на будаўніцтва жылля ў адным з шматкватэрных дамоў Мінска.

У гутарцы з журналістамі да пачатку нарады Міхаіл Русы паведаміў, што па даручэнні спікера Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай займаецца высвятленнем усіх складанасцяў, з якімі сутыкнуліся грамадзяне.

— Сёння мы праводзім чарговы разгляд калектыўнага звароту шматдзетных сям'яў па цэлым шэрагу пытанняў, з якімі яны сутыкнуліся пры атрыманні жылля ў Мінску. Тут сабрана вялікае кола прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, службаў Мінгарвыканкама, міністэрстваў юстыцыі, архітэктуры і будаўніцтва, працы і сацыяльнай абароны для таго, каб дэталёва разабрацца ў сітуацыі і знайсці магчымасці высветліць прычыны, чаму ў людзей з'явілася неабходнасць пісаць скаргі, і, калі ёсць недапрацоўкі на заканадаўчым узроўні, аператыўна знайсці рашэнне ў гэтым кірунку, — патлумачыў абраны фармат сустрэчы старшыня профільнай камісіі.



Фота БелТА.

Ён перакананы: калі людзі звяртаюцца, гэта дапамагае заканадаўцам бачыць усе недахопы ў нарматыўнай базе, якую можна і неабходна аператыўна дапрацаваць.

— 15 сакавіка пачала дзейнічаць абноўленая Канстытуцыя, і цэлы шэраг нарматыўна-прававых актаў будзе перапрацаваны. Таму будзе рэальная магчымасць частку такіх прыкладаў аператыўна ўнесці і дапоўніць заканадаўства, — адзначае Міхаіл Русы.

Што да сённяшняй размовы, паводле меркавання сенатара, яна будзе дастаткова сур'ёзнай:

— На пустым месцы 40 чалавек па адным і тым жа пытанні звяртацца не будуць. Хосьці дзесьці недапрацаваў, магчыма, да канца не высветлілі ўсе нюансы. Таму мы паслухаем кожны орган дзяржаўнага кіравання і знойдзем рашэнне гэтага пытання.

Сенатар нагадаў: калі шматдзетная сям'я звярнулася з заявай аб атрыманні жылля з субсідыямі і сацыяльнымі гарантыямі, якія прадугледжаны ў адпаведнасці з заканадаўствам, на працягу года яны павінны быць накіраваны на яго будаўніцтва.

— Чаму тут не спрацавала, хто ў гэтым вінаваты і калі ёсць нейкі недахоп у заканадаўстве — усё высветлім і прымем рашэнне, каб людзі былі задаволены, — падкрэсліў старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

Паводле яго ацэнкі, работа з людзьмі — гэта свайго роду экспертная ацэнка заканадаўства на прадмет яго зручнасці і эфектыўнасці работы.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ СТАСУНКАЎ

## Сяргей СІВЕЦ правёў у Савеце Рэспублікі асабісты прыём грамадзян

**Гучалі пытанні, якія датычыліся ўдасканалення заканадаўства, работы па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў, рэалізацыі права на памілаванне і іншыя. Старшыня профільнай камісіі ўсім заяўнікам даў падрабязныя тлумачэнні.**

Адзначым, што для аператыўнага вырашэння пытання ў сферы зямельных праваадносін на прыём былі запрошаны прадстаўнікі аднаго з сельвыканкамаў Мінскага раёна, што дазволіла дэталёва вывучыць усе аспекты праблемы. Яе рашэнне парламентарый узяў на кантроль.

— Звароты грамадзян — рэалізацыя канстытуцыйнага права на ўдзел ва ўпраўленні справамі дзяржавы, — адзначыў па выніках прыёму Сяргей Сівец. — Яны камунікуюць з органамі дзяржаўнай улады, факусіруюць увагу адпаведных службовых асоб на тых праблемных пытаннях, якія ёсць у нашым грамадскім жыцці.



Фота sovrep.gov.by

Акрамя таго, у гутарцы з журналістамі ён прывёў наступныя лічбы. За два месяцы бягучага года — студзень, люты — у Савет Рэспублікі паступіла 716 зваротаў грамадзян, з іх па профілі камісіі — 152. У прыватнасці, 122 было звязана з канстытуцыйным рэферэндумам, унясеннем змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Паводле ацэнкі старшыні профільнай камісіі, гэта сведчыць аб высокай грамадскай актыўнасці і ініцыятыўнасці грамадзян і іх глыбокай інтэграцыі ў гэты працэс.

— Рост зваротаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года — амаль 36 %, — паведаміў Сяргей Сівец. — З аднаго боку, добра, бо сведчыць аб тым, што людзі бачаць эфектыўнае вырашэнне іх праблем заканадаўчай уладай. З другога — гэта і адпаведны негатыўны момант.

Сенатар тлумачыць: больш за трэціну зваротаў можна было б вырашыць аператыўна і эфектыўна на мясцовым узроўні — без звароту за сотню кіламетраў у Савет Рэспублікі.

— Таму, з аднаго боку, сенатары актыўна ўцягнуты ў вырашэнне праблем грамадзян, з другога — мы разумеем, што дзесьці не дапрацоўваюць мясцовыя органы ўлады, — адзначае ён.

Разам з тым прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях як форму работы з насельніцтвам сенатар лічыць цалкам апраўданай:

— Эфектыўнасць падобнага роду зваротаў грамадзян з ініцыятыўнымі прапановамі, нават са скаргамі на дзеянні органаў дзяржаўнага кіравання, для нас выступае адпаведным сігналам, каб звярнуць асаблівую ўвагу на пэўную сферу грамадскіх адносін і, магчыма, ініцыяваць у заканатворчым плане пэўныя змены, — рэзюмаваў старшыня профільнай камісіі.

# Зняцце абмежаванняў пойдзе на карысць інтэграцыйнаму супрацоўніцтву і развіццю Саюзнай дзяржавы

**Такое меркаванне выказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ.**

У гутарцы з журналістамі старшыня профільнай камісіі пракаментаваў скасаванне з сённяшняга дня антыковідных абмежаванняў, якія да гэтага дзейнічалі паміж Беларуссю і Расіяй.

— Мы заўсёды займалі пазіцыю, што абмежаванні, якія звязаны са свабодай перамяшчэння нашых грамадзян, не ўплываюць на максімізацыю бяспекі з пункту гледжання санітарна-эпідэміялагічных норм, — адзначыў сенатар. — Але тое, што яны перашкаджаюць рэалізацыі адпаведных правоў і свабод нашых грамадзян (у першую чаргу права на свабоду перасоўвання, права на працу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, свабоду капіталаў, усё, што ў нас фармалізавана на ўзроўні інтэграцыйнай нарматворчасці), гэта безумоўна.

Старшыня профільнай камісіі падкрэсліў: усе гэтыя фактары не садзейнічалі далейшаму паглыбленню інтэграцыйнага супрацоўніцтва і будаўніцтва Саюзнай дзяржавы.

— Мы разумелі, што яны носяць часовы характар, але ўсе былі зацікаўлены ў тым, каб максімальна скараціць час і дзеянне гэтых абмежавальных норм, — канстатаваў Сяргей Сівец. — Мы можам толькі вітаць іх скасаванне, асабліва цяпер — ва ўмовах беспрэцэдэнтнага санкцыйнага ціску, які аказваецца на Расійскую Федэрацыю і Рэспубліку Беларусь.

Сенатар нагадаў аб наяўнасці 28 саюзных праграм, фармалізаваных у Дэкрэце № 6 Вышэйшага дзяржсавета.

— Ужо сёлета да канца года па шэрагу праграм павінны быць прыняты канкрэтныя заканадаўчыя рашэнні, звязаныя з уніфікацыяй, гарманізацыяй нацыянальнага заканадаўства Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў ён.

Сяргей Сівец акцэнтаваў увагу на тым, што для працэсу эфектыўнай рэалізацыі планаў не трэба ўсталёўваць ніякія адміністрацыйныя перашкоды.

— Каб мы мелі магчымасць нават у межах мытных праваадносін спакойна перадольваць тэрыторыю ў рамках саюзнай прасторы, каб не стваралі дадатковыя складанасці для нашых грамадзян у частцы рэалізацыі сацыяльна-эканамічных правоў, — патлумачыў ён і зрабіў слушную выснову: — Гэта ўсё зроблена, я лічу, своечасова і пойдзе на карысць нашаму далейшаму інтэграцыйнаму супрацоўніцтву і развіццю Саюзнай дзяржавы.

# ВАЖНА БЫЦЬ РАЗАМ,

## або Чаму ва ўмовах санкцыйнага ціску зняцце Расіяй абмежаванняў на перамяшчэнне набывае асаблівую актуальнасць

**Аб гэтым расказала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ.**

— Свабода перамяшчэння — адно з канстытуцыйных правоў грамадзяніна. Зняцце ўсіх абмежаванняў, звязаных з беспераходным перамяшчэннем грамадзян у рамках Саюзнай дзяржавы, — правільнае і патрэбнае ў цяперашніх умовах рашэнне, дасягнутае на ўзроўні ўрадаў нашых краін, — падкрэслівае сенатар.

Яна адзначае: бакі разумелі, што антыковідныя абмежаванні носяць часовы характар і будуць знятыя.

— Але гэта рашэнне набывае асаблівую актуальнасць менавіта цяпер, калі беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск калектыўнага Захаду на Беларусь і Расію ўплывае на выбудаваныя намі вытворчыя ланцужкі і напрацаваныя каапераційныя сувязі, — акцэнтуе ўвагу Таццяна Рунец.

Старшыня профільнай камісіі канстатуе: у гэтых умовах як ніколі важна быць разам, быць адзіным цэлым і ўстараняць перашкоды на шляху адзін аднаго.

— У гэтым і заключаецца сутнасць саюзнага будаўніцтва, калі грамадзяне абедзвюх дзяржаў маюць магчымасць бесперашкодна перасоўвацца, узаемадзейнічаць, супрацоўнічаць на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, — перакапана суразмоўніца.

Яна выказала ўпэўненасць, што рашэнне аб зняцці ўсіх абмежаванняў паслужыць на карысць умацавання эканамічнай інтэграцыі абедзвюх краін.

— Нас — парламентарыяў — чакае актыўная работа па ўніфікацыі і гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў, прадугледжаная ў рамках рэалізацыі 28 саюзных праграм, зацверджаных на ўзроўні Вышэйшага дзяржсавета. Гэта ў сваю чаргу паспрыяе эканамічнаму збліжэнню Беларусі і Расіі і ўмацаванню пазіцый у процівагу санкцыйнаму прэсінгу недружалюбных нам краін, — рэзюмуе Таццяна Рунец.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

АКЦЭНТЫ

# РОЛЯ МОЛАДЗІ Ў РАЗВІЦЦІ КРАІНЫ НЕАЦЭННАЯ

**На мінулым тыдні старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў прыём непаўналетніх і іх законных прадстаўнікоў у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Гродна.**



Як паведамілі ў профільнай камісіі Савета Рэспублікі, да сенатара па розных пытаннях звярнуліся навучэнцы адной з гродзенскіх сярэдніх школ, музычнага каледжа, бацька-выхавальнік дзіцячага дома сямейнага тыпу, мама падлетка.

У развіццё агучаных у ходзе прыёму прапаноў у найбліжэйшы час парламентарый правядзе міжведамасныя нарады па пытаннях удасканалення дзейнасці дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, музычных каледжаў, укаранення рэгіянальных патрыятычных ініцыятыў.

Падсумоўваючы вынікі правядзення прыёму, Віктар Лісковіч у гутарцы з журналістамі адзначыў: людзі прыйшлі з ініцыятывамі, якія можна ўкараняць у рэгіёнах і ў краіне.

— Я ўражаны такім становішчам у Гродне, якое склалася на прыёме непаўналетніх грамадзян і асоб, якія іх прадстаўляюць, — кажа сенатар і канкрэтызуе: — Прагучаў толькі адзін крытычны зварот, які датычыўся ўзаемаадносін паміж дарослымі і падлеткамі. Ды і тое, гэтае пытанне ўжо практычна вырашана. Усе астатнія хацелі данесці і агучыць свае прапановы, якія ўжо сёння апрабаваныя ў рэгіёнах і іх можна ўкараняць у краіне.

Як патлумачыў старшыня профільнай камісіі, усе прапановы накіраваны на патрыятычнае выхаванне насельніцтва, прычым не толькі дзяцей і моладзі, але і дарослых.

— Было агучана пытанне аб падтрымцы таленавітай моладзі, — прыводзіць прыклад Віктар Лісковіч. — Аб дапамозе ў набыцці і выкарыстанні музычных інструментаў, каб дзеці маглі цалкам рэалізаваць свой талент. Узнімаліся пытанні заахвочвання таленавітай моладзі.

І сапраўды, трэба знайсці бонусы для заахвочвання тых, хто мае задаткі і хоча развівацца далей. Так, у найбліжэйшы час на працоўных нарадах у зацікаўленых міністэрствах і ведамствах гэтыя прапановы будуць агучаны, каб выпрацаваць канкрэтныя прапановы для далейшай іх рэалізацыі.

Таксама парламентарый звярнуў увагу на тое, што агучаныя на прыёме прапановы датычыліся фарміравання маладога чалавека, які ўвойдзе ў дарослае жыццё з актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

— Акрамя таго, яны накіраваны на фарміраванне ўстойлівага меркавання ў маладога пакалення, якое фарміруе жаданне працаваць, развіваць рэгіён і свой горад, імкнуцца зрабіць свой унёсак у развіццё Беларусі. Гэта і ёсць патрыятызм. І роля моладзі ў развіцці краіны і фарміраванні каштоўнасцяў, якімі валодае наша грамадства, проста неацэнная, — рэзюмаваў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

### ❍ У тэму

**У гэты дзень сенатар прыняў удзел у адкрытым дыялогу са студэнтамі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы на тэму «Захоўваючы гісторыю — будуем будучыню».**

На сустрэчы са студэнцкім актывам парламентарый абмеркаваў пытанні ролі моладзі ў захаванні гістарычнай памяці беларусаў, іх ініцыятывы па грамадзянска-патрыятычным выхаванні насельніцтва Беларусі і іншыя.

— Мы разам кажам аб подзвігу нашага гераічнага народа, згадваем трагічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны. Упэўнены, што над Беларуссю заўсёды будзе чыстае, светлае неба. А страшныя ўрокі вайны мы ніколі не забудзем. Самае малое, што мы можам зрабіць, — захаваць памяць аб тых, хто загінуў дзеля нашай будучыні, — адзначыў у звароце да моладзі Віктар Лісковіч.

У мерапрыемстве таксама прынялі ўдзел дэпутат Палаты прадстаўнікоў Лілія Кір'як, старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Барыс Фёдараў, рэктар ГрДУ імя Я. Купалы Ірына Кітурка.

МІЖПАРЛАМЕНЦКІ ВЕКТАР

# Парламентарыі — за падтрыманне міру і бяспекі

## У Інданезіі праходзіць 144-я Асамблея МПС

**Мерапрыемства распачало сваю работу ў горадзе Нуса-Дуа ў нядзелю, 20 сакавіка. Завершыцца — 24 сакавіка.**

Удзел у пасяджэнні Міжпарламенцкага саюза прымаюць і беларускія парламентарыі: **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ.**




У афіцыйнай цырымоніі адкрыцця 144-й Асамблеі МПС прынялі ўдзел Прэзідэнт Рэспублікі Інданезія Джок Відода, спікер Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Інданезія Пуан Махарані і прэзідэнт МПС Дуартэ Пачэка.

Дарэчы, беларускі сенатар уваходзіць у склад Бюро Пастаяннага камітэта МПС па справах міру і міжнароднай бяспекі і кансультатыўную групу высокага ўзроўню МПС па супрацьдзеянні тэрарызму і гвалтоўнаму экстрэмізму.

Сяргей Рачкоў на палях 144-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза сустрэўся са старшынёй Камітэта па міжпарламенцкім супрацоўніцтве Савета народных прадстаўнікоў Рэспублікі Інданезія Фадлі Зонам.

Бакі разгледзелі актуальныя пытанні 144-й Асамблеі МПС, а таксама двухбаковага беларуска-інданезійскага, у тым ліку рэгіянальнага, супрацоўніцтва. Сенатар падкрэсліў важнасць міжпарламенцкіх кантактаў ва ўмацаванні партнёрства.

Таксама была абмеркавана інданезійская ініцыятыўная прапанова аб унясенні ў парадак дня асамблеі надзвычайнага пункта аб ролі парламентаў у падтрымцы мірнага вырашэння расійска-ўкраінскага канфлікту.

Акрамя таго, былі падкрэслены поспехі двухбаковага ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічным вымярэнні, адзначана перспектыўнасць развіцця новых праектаў у адукацыйнай і культурнай сферах.

Разам з тым бакі дамовіліся актывізаваць міжпарламенцкія кантакты па меры стабілізацыі сітуацыі з каранавірусам.

У панядзелак, 21 сакавіка, старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі выступіў на пасяджэнні Пастаяннага камітэта МПС па справах міру і міжнароднай бяспекі па пытанні «Пераасэнсаванне падыходу да мірных працэсаў з мэтай умацавання працяглага міру».

Парламентарый катэгарычна адхіліў інсінуацыі адносна ўцягнутасці Беларусі ў канфлікт ва Украіне:

— Беларусь не ўдзельнічае ў ваенная аперацыі ў суседняй краіне. Прэзідэнт Беларусі распачаў сур'ёзныя ініцыятыўныя намаганні, каб пераканаць Украіну пайсці на перагаворы з Расіяй для пошуку шляхоў мірнага ўрэгулявання сітуацыі. Беларусь забяспечыла бяспеку і лагістычныя ўмовы правядзення перагавораў, тры раўнды якіх адбыліся на тэрыторыі нашай краіны.

Сенатар раскрытыкаваў Захад за адкрыты аднабаковы падыход да ацэнкі крызісу і замоўчванне намаганняў Беларусі па зніжэнні напружанасці вакол Украіны.

— У пытаннях забеспячэння міру і бяспекі недапушчальныя падвойныя стандарты, — падкрэсліў парламентарый.

Што датычыцца пленарных пасяджэнняў, на асамблеі разгледзелі пытанне «Выхад на нулявую мяжу: мабілізацыя парламентаў на прыняцце практычных мер у сувязі са зменамі клімату».

У рамках мерапрыемства прайшлі пасяджэнні органаў МПС, уключаючы кіруючы савет, пастаянныя камітэты і іншыя рабочыя структуры асамблеі.

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, беларускі парламентарый даваў пазіцыю Рэспублікі Беларусь па тэме агульнай дыскусіі, аб імплементацыі раней прынятых рэзалюцый і выніковых дакументаў асамблеі, выступіў па пытаннях забеспячэння бяспекі і стабільнасці ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне, глабальнай забароны ядзерных выпрабаванняў, процідзеянні міжнароднаму тэрарызму.

Па выніках мерапрыемства ўдзельнікі асамблеі прымуць прадстаўленую Пастаянным камітэтам па пытаннях міру і міжнароднай бяспекі рэзалюцыю «Пераасэнсоўваючы і перабудоўваючы падыход да мірных працэсаў для спрыяння ўсталяванню трывалага міру» і ініцыяваную Пастаянным камітэтам па ўстойлівым развіцці рэзалюцыю «Выкарыстанне інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій у якасці інструмента для сектара адукацыі, у тым ліку падчас пандэміі».

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

МЕРКАВАННЕ

# Сенатар: «Сацыяльная палітыка дзяржавы накіравана на паляпшэнне жыцця і дабрабыту шматдзетных сем'яў»

**У Навагрудку прайшоў раённы агляд-конкурс «Шматдзетная сям'я — 2022». У склад журы конкурсу ўвайшла член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні дырэктар УА «Навагрудскі дзяржаўны сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй» Эльвіра САРОКА.**

За права называцца найлепшай змагаліся дзевяць шматдзетных сем'яў. Кожная з іх прадставіла яркія візітоўкі «Радавод» і арыгінальныя сацыяльна значныя праекты, якія адлюстроўваюць унёсак сям'і ў жыццё рэгіёна. Гледачы даведаліся пра захапленні канкурсантаў, таленты, каштоўнасці, сямейныя традыцыі і продкаў, якімі яны ганарацца. Пераможцам конкурсу стала сям'я Каўцэвіч з Навагрудка, у якой выхоўваюцца трое дзяцей.

— Дзеці — наша будучыня. І невыпадкова сацыяльная палітыка Беларусі накіравана на паляпшэнне жыцця і дабрабыту шматдзетных сем'яў. Гэта і вылучэнне сямейнага капіталу, і падтрымка пры будаўніцтве жылля, і іншыя льготы. Прыемна адзначыць, што з кожным годам колькасць шматдзетных сем'яў на Навагрудчыне павялічваецца. Сёння ў раёне пражывае 609 сем'яў, у якіх выхоўваецца больш чым дзве тысячы дзяцей, — падкрэсліла парламентарый.

# ДВОР А–ЛЯ МІНЬЁН

*(Заканчэнне. Пачатак на 7–й стар.)*

На дваровай зоне ўстанавілі гульнявое абсталяванне, балансіры, арэлі, горку, зрабілі валейбольную пляцоўку са штучным пакрыццём. Творча падышлі ў гэтым двары і да афармлення дрэў і зялёных насаджэнняў.

— Нашы ялінкі і клумбы таксама паглядзіце, — запрасілі падчас агляду актывісты старэйшага ўзросту. — Энтузіязм маладых захапіў і нас, пенсіянераў: мы самі хвойнікі высадзілі, клумбу зрабілі. Спадзяёмся, улетку прыгажосць для вачэй будзе. Нам бы вось яшчэ дрэў у двары больш. Будзе не горш, чым на «Праспекце цудаў».

## «Губернатарская» баскетбольная пляцоўка

У камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, створанага пры ЖЭУ № 1 КЖРЭУП «Сельмашаўскае», пакуль няма назвы, што не перашкаджае на гэтай тэрыторыі ўвасабляць у жыццё цікавыя праекты добраўпарадкавання дваровай зоны.

Вылучаецца невялікі, але вельмі ўтульны двор на вуліцы 8-й Іншагародняй. Актывісты гэтага камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ўпэўненыя: для таго, каб у доме і ў двары было камфортна, панавала хатняя атмасфера, павінны пастарацца самі жыхары.

— Мы імкнёмся згуртавацца, натхніць на добрыя справы, — падкрэсліў **старшыня грамадскага аб'яднання Мікалай КОЛАШ.** — Але нікол не бывае лішняй падтрымка органаў улады, дэпутацкага корпуса, жыллёва-камунальнай службы. І мы яе атрымліваем.

Новая сучасная баскетбольная пляцоўка ў гэтым двары з'явілася пры падтрымцы былога старшыні аблвыканкама Генадзя Салаўя.

З устаноўкай арэляў дапамагла адміністрацыя Чыгуначнага раёна Гомеля, КЖРЭУП «Сельмашаўскае» пасадзейнічала ў абсталяванні пясочніцы для малых.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Данчанка дапамог з арганізацыяй асвятлення гульнявой зоны. Нядаўна з'явілася новая валейбольнае поле. Важна, што гаспадары двара запрашаюць карыстацца ўсімі спартыўнымі пляцоўкамі жыхароў суседніх дамоў.

— Усё ўбачанае падчас аб'езду дэпутатамі гарсавета, вядома, уражвае. Энтузіясты падыходзяць крэатыўна да ўвасаблення сваіх праектаў: уносяць у афармленне дваровых тэрыторый элементы казкі, клапоцяцца аб сваіх дзецях, каб яны раслі ва ўтульнай атмасферы, — падзяліўся ўражаннямі **старшыня Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай КАВАЛЕВІЧ.** — Двор — гэта працяг дома, і мы бачым, што тэрыторый, дагледжаных рукамі жыхароў, у Гомелі становіцца ўсё больш.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

МЕРКАВАННЕ

# ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ: КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ расказала аб мадэлі кіравання ў сферы імпартазамяшчэння:**

— Відавочна, што ва ўмовах санкцый трэба будзе вельмі аператыўна карэкціраваць праграмы развіцця прадпрыемстваў і рэгіёнаў на бягучы год, — перакананы старшыня профільнай камісіі. — Перш за ўсё гэта датычыцца планаў па імпартазамяшчэнні, якія штогод распрацоўваюцца абласцямі і Мінскам, галіновымі міністэрствамі і канцэрнамі.

Яна звяртае ўвагу на тое, што алгарытм, які функцыянаваў на працягу многіх гадоў, не дазваляе эфектыўна адказваць на сучасныя выклікі ў сферы імпартазамяшчэння, і канстатуе: па сутнасці, беларускія вытворцы вымушаны перайсці на сітуацыйную мадэль кіравання гэтай дзейнасцю.

Па меркаванні старшыні профільнай камісіі, у рамках гэтай мадэлі трэба канцэнтраваць намаганні па двух кірунках. Першы — гэта сыравіна, другі — інвестыцыйны імпарт.

— Неабходна аператыўна знайсці альтэрнатыву па сыравінных пазіцыях, пастаўкі па якіх часова спынены, — кажа Таццяна Рунец. — На прадпрыемствах, якія перапрацоўваюць такую сыравіну і выпускаюць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю, працуюць тысячы людзей. Таму важнасць гэтага кірунку відавочная. Тут павінны добра папрацаваць забеспячэнцы і лагісты.



> Відавочна, што ва ўмовах санкцый трэба будзе вельмі аператыўна карэкціраваць праграмы развіцця прадпрыемстваў і рэгіёнаў на бягучы год.

Што датычыцца другога кірунку — інвестыцыйнага імпарту, — сенатар перакананая: гэта зона адказнасці канструктарскіх бюро прадпрыемстваў, навуковых калектываў, а таксама галіновых рэгулятараў і Мінэканомікі, якое каардынуе дзейнасць па імпартазамяшчэнні ў цэлым па краіне.

— Калі недастаткова ўласных кампетэнцый, то вырашаць пытанне з інвестыцыйнымі таварамі трэба за кошт пашырэння кааперацыйных ланцужкоў з партнёрамі па інтэграцыйных аб'яднаннях, — адзначае Таццяна Рунец. — Прычым рабіць гэта неабходна на доўгатэрміновай аснове.

Яна звяртае ўвагу, што ў сувязі з гэтым асаблівую актуальнасць набывае пытанне ўзгодненай прамысловай палітыкі ў ЕАЭС і Саюзнай дзяржаве. Існуючыя вытворчыя магутнасці не павінны дубліраваць адно аднаго, а разумна дапаўняць.

— У гэтай мадэлі я свядома не згадваю спажывецкі імпарт. У дадзеным сегменце мы і так дастаткова паспяхова прасунуліся. Беларуская прадукцыя не саступае па якасці імпартнай, а з улікам бягучай курсавой дынамікі выгадна адрозніваецца па цане. Такім чынам, на мой погляд, сёння гэта некрытычны сегмент з пункту гледжання імпартазамяшчэння, — рэзюмуе старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

# У ФОКУСЕ ЎВАГІ СЕНАТАРСКАГА КОРПУСА

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ правёў выязны асабісты прыём грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Сухапольскім сельвыканкаме Пружанскага раёна.**

Тэмы, па якіх звярталіся заяўнікі, датычыліся транспартнага абслугоўвання сельскіх населеных пунктаў, рэканструкцыі сетак электразабеспячэння.

Па ўсіх пытаннях сенатарам дадзены даручэнні адказным выканаўцам. Звароты будуць знаходзіцца на кантролі да іх канчатковага вырашэння.

***

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік начальніка каардынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Марына ІЛЬІНА сустрэлася з працоўным калектывам пачатковай школы № 29 г. Мінска.**

Парламентарый расказала аб прынятых змяненнях і дапаўненнях у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Падчас сустрэчы былі ўзняты пытанні прафесійнай дзейнасці, развіцця сістэмы адукацыі, а таксама асноўныя навацыі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах старшыня Столінскага райвыканкама Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ сустрэўся з прадстаўнікамі працоўнага калектыву вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага торфапрадпрыемства «Глінка».**

З удзельнікамі — інжынерна-тэхнічнымі работнікамі, механізатарамі, рабочымі — адбылася размова аб функцыянаванні ва ўмовах санкцыйнага ціску «калектыўнага» Захаду.

— Агрэсіўная санкцыйная палітыка Захаду стварае дадатковыя стымулы інтэграцыйнага збліжэння з Расіяй, Кітаем і іншымі краінамі. У гэтых умовах нам трэба пераарыентавацца на іншыя рынкі, — падкрэсліў парламентарый.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Тамара ШАТЛІКАВА наведала Маларыцкую сярэднюю школу № 2, што на Брэстчыне.**

Сенатар абмеркавала з членамі працоўнага калектыву практычныя пытанні рэалізацыі палажэнняў абноўленага Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама азнаёмілася з дзейнасцю ўстановы адукацыі па прафесійнай падрыхтоўцы навучэнцаў, наведала швейную майстэрню і выставу работ.

Дзеля ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы школе падораны дзве прафесійныя швейныя машынкі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 22 сакавіка 2022 года.**

Бацькаўшчына

*У пошуках страчанага*

# І ДОЙЛІДЫ, І ТВОРЦЫ

**Вандруючы па Міншчыне, не мінайце старажытны Дзяржынск (ці Койданаў — так называўся сённяшні райцэнтр). Некалі я ліставаўся з рускай пісьменніцай Нінай Жыбрык з Марый Эл. Знайшоў яе як землячку з дзяржынскімі, койданаўскімі каранямі (нарадзілася яна ў Малых Навасёлках). І па памяці магу пераказваць, як узнёсла яна адгукалася пра сваю радзіму, якімі, на першы погляд, дробязнымі і разам з тым узвышанымі дэталямі дзялілася ў адказ на мае роспыты. Больш расказвала пра роднае паселішча, родныя сцежкі, чым пра сваю ўласную творчасць...**

І ўзіраючыся цяпер у старыя краявіды, у выявы, якія нагадваюць пра гістарычныя вуліцы старажытнага мястэчка — Татарскую, Станькаўскую, Рубяжэвіцкую, Плябанскую ды іншыя, думаеш пра тую сябрыну землякоў, сябрыну койданаўцаў, ураджэнцаў і Дзяржынска, і блізкіх ваколіц, якія па свеце (не толькі па Беларусі) неслі славу роднай старонкі. Дарэчы, Малыя Навасёлкі — зусім блізка ад Дзяржынска, усяго за 6 км, ад станцыі Койданава — 8 км... Ніна Жыбрык нарадзілася ў 1933 годзе на хутары паблізу Малых Навасёлак. Закончыла сярэднюю школу ў Дзяржынску. Затым вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Трапіла ў Марый Эл, куды прыехала ў сувязі з размеркаваннем мужа — па яго лесатэхнічнай спецыяльнасці. Жыла ў Волжску. Незавершаная вышэйшая адукацыя не давала спакою. Але не было дакументаў за тры курсы БДУ. І тады маладая жанчына пераводзіцца на другі курс завочнага аддзялення біяфака Казанскага дзяржаўнага ўніверсітэта... Але малая дачка, якая часта хварэла, іншыя калізіі жыцця не далі завяршыць вучобу ва ўніверсітэце. Пайшла працаваць рабочай. Затым закончыла Марыйскі цэлюлозна-папяровы тэхнікум. Яе ўзялі на работу лабарантам у лакафарбавае аддзяленне лыжнага цэха. У 1967 годзе ўбачылі свет першыя вершаваныя зборнікі нашай землячкі — «Вясёлка» і «Цёплыя далоні трыпутніка». З часам з'явіліся новыя кнігі. Ніна Жыбрык займалася і драўлянай скульптурай. Пра гэта шмат пісалі не толькі ў марыйскім перыядычным друку, але і ва ўсесаюзных выданнях. А ў канцы свайго жыцця паэтэса настойліва занялася даследваннем свайго радаводу — Гурыных і Умецкіх. Дарэчы, з першага роду — Герой Савецкага Саюза контр-адмірал Антон Іосіфавіч Гурын. Камандзір эсмінца «Гремящий», які ўдзельнічаў у марыйскіх падзеях, апісаных Валянцінам Пікулем у рамане «Рэквіем каравану PQ-17».

...Можа быць, нешта асаблівае ёсць у койданаўска-дзяржынскай прасторы, што выпеставала гэтулькі гісторыкаў, шукальнікаў гістарычнай памяці? З тых самых Малых Навасёлак — і гісторык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Ермаловіч (1921—2000). Скончыўшы сярэднюю школу ў Дзяржынску, ён да пачатку Вялікай Айчыннай вайны вучыўся ў Мінскім педінстытуце. Дрэнны зрок перашкодзіў трапіць у войска. У час вайны выкладаў рускую мову ў Мардовіі. Вярнуўшыся ў Беларусь, працаваў настаўнікам — спярша на Віцебшчыне, затым у Дзяржынску. Цяга да ведаў не давала спакою маладому чалавеку. У 1948—1955 гг. працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Маладзечанскім педінстытуце. Выйшаўшы па стане здароўя на пенсію, збіраў матэрыялы для сваіх будучых гістарычных работ. У 1990 годзе выйшла яго кніга «Старажытная Беларусь: Полацк і Новагародскі перыяды», у 1994-м — «Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд», у 2000 годзе — «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае»...

А з Вялікімі Навасёлкамі звязаны лёс беларускага пісьменніка, мовазнаўцы, мастака, скульптара Каруся Каганца (1868—1918), які нарадзіўся ў Табольску ў сям'і сасланага ў Сібір удзельніка паўстання 1863—1864 гг. У 1874 годзе сям'я вярнулася ў Беларусь. Жылі ў вёсцы Засулле на Стаўбцоўшчыне і ў вёсцы Прымагілле каля Койданава. Зарабляючы на хлеб чым заўгодна, Карусь Каганец жыў клопатамі асветніка, літаратара. Многія творы пісьменніка засталіся ў рукапісах. Пры жыцці ўбачыў свет асобным выданнем вадэвіль К. Каганца «Модны шляхцюк» (у Санкт-Пецярбургу ў 1910 годзе). Памёр літаратар зусім нечакана, падчас наведвання сваякоў. Пахаваны ў Навасёлках. Сапраўднае імя пісьменніка — Казімір-Рафал Каралевіч Кастравіцкі. З гэтага роду — і славуты французскі паэт Гіём Апалінэр (1880 — 1918)...

Віцкаўшчына — крыху далей ад Дзяржынска. Уваходзіць у склад Фаніпальскага сельсавета. Тут нарадзіўся гісторык, археограф, этнограф, краязнавец, мемуарыст Мікалай Улашчык (1906 — 1986). Аўтар многіх прац па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, доктар гістарычных навук, чалавек пакручастага лёсу, які надзвычай шмат паспеў зрабіць насуперак драматычным выпрабаванням лёсу. У канцы свайго жыцця ён стварыў унікальную, у многім узорную кнігу для беларускага краязнаўства — «Была такая вёска» (па-беларуску асобнай кнігай яна ўбачыла свет у 1989 годзе; на рускай мове надрукавана, таксама асобным выданнем, у Маскве ў 2003 годзе). Амаль чатыры дзесяцігоддзі з жыцця роднага паселішча пададзены ў гісторыка-этнаграфічным нарысе настольнай красамоўна, што бачацца вартымі ўвагі кожнага беларуса, родам з любога паселішча нашай Айчыны!..

З дзяржынска-койданаўскім маёнткам Дзягільня звязаны паэт, этнограф, мемуарыст, падарожнік Адольф Янушкевіч (1803 — 1857). Нарадзіўся ў Нясвіжы. У Віленскім універсітэце быў блізкі да філарэтаў. У маладосці падарожнічаў па Еўропе. Быў знаёмы з Адамам Міцкевічам. У славутай паэме «Дзяды» Міцкевіча Янушкевіч — прататып персанажа Адольф. Удзельнічаў у паўстанні 1830—1831 гг. Быў арыштаваны і сасланы ў Сібір. У ссылцы падарожнічаў па Сібіры, Кыргызстане, Казахстане. Вярнуўся ў Беларусь у 1856 годзе, жыў у радавым маёнтку Дзягільня. Памёр 19 чэрвеня 1957 года. Пахаваны на фамільных могілках. Падарожныя запісы ці пісьмы з ссылкі Адольфа Янушкевіча сабраў яго брат Яўстафій: у 1861 годзе ў Парыжы было здзейснена выданне ў дзвюх кнігах «Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лістоў з кыргызскіх стэпаў». У Астане (Нур-Султане), Алматы і Усць-Каменагорску імем нашага земляка названы вуліцы. А ў нас, у Беларусі, росшукам матэрыялаў, звестак пра Адольфа Янушкевіча займаецца пісьменніца Алена Стэльмах, якая, будзем спадзявацца, выдасць і кнігу пра славутага земляка.

Такое сузор'е ўлюбёных у гісторыю землякоў у межах невялікай койданаўска-дзяржынскай прасторы не можа не ўражваць. Памяць пра лёсы яркіх асоб падштурхоўвае да распрацоўкі надзвычай цікавых турыстычна-экскурсійных маршрутаў. А ў Дзяржынскай раённай бібліятэцы, дзе многія дзесяцігоддзі вядзецца руплівая работа на ніве гістарычнага і літаратурнага краязнаўства, можа быць пачатак, пункт адліку любога з задуманых маршрутаў, любога з паходаў мясцінамі Каруся Каганца, Мікалая Улашчыка, Міколы Ермаловіча, Адольфа Янушкевіча... Дарэчы, у дзяржынскай кніжніцы захоўваецца асобным фондам кнігазбор гісторыка, журналіста, краязнаўца Анатоля Валахановіча (1939 — 2016). Ён хоць і нарадзіўся ў Мінску, самым цесным чынам звязаны з горадам і раёнам. Тут настаўнічаў у пачатку свайго дарослага жыцця. Шмат зрабіў дзеля стварэння гісторыка-дакументальнай хронікі Дзяржынскага раёна «Памяць». Выдаў асобны кніжны нарыс пра Дзяржынск.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.*



Дзяржынск (Койданава). Царква (пач. XX ст.)



Станцыя Негарэлае. 1930-я гады.



Дзяржынск (Койданава). Вакзал 1918 г.



Дзяржынск (Койданава). Базар 1918 г.

# ИНФОРМАЦИЯ о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «МНИПИ» за 2021 год

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2022 г.

| АКТИВЫ | Код строки | На 31.12.2021 (тыс. руб.) | На 31.12.2020 (тыс. руб.) |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | **190** | **17 152** | **15 464** |
| Основные средства | 110 | 14 252 | 12 559 |
| Нематериальные активы | 120 | 12 | 17 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 2 651 | 2 649 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 208 | 208 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 29 | 31 |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | **290** | **8 511** | **6 894** |
| из них: сырье, материалы и др. аналогичные активы | 211 | 681 | 984 |
| незавершенное производство | 213 | 3 274 | 2 153 |
| готовая продукция и товары | 214 | 1 662 | 1 606 |
| Дебиторская задолженность | 230-250 | 729 | 1 360 |
| Денежные средства | 270 | 2 165 | 791 |
| **БАЛАНС – всего (активы)** | **300** | **25 663** | **22 358** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | **490** | **20 931** | **18 690** |
| **Краткосрочные активы, в том числе** | **690** | **4 732** | **3 668** |
| в том числе: кредиторская задолженность по поставщикам | 631-632 | 1 634 | 1 634 |
| прочая кредиторская задолженность | 633-670 | 2 944 | 1 944 |
| **БАЛАНС – всего (пассивы)** | **700** | **25 663** | **22 358** |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 2021 год

| Наименование показателей | За 2021 год (тыс. руб.) |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 6 683 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | (6 431) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 252 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | (179) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 342 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 415 |
| Налог на прибыль | (47) |
| Чистая прибыль (убыток) | 368 |

Получено аудиторское заключение от ООО «МастерАудит и Консультации» о том, что бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «МНИПИ» по состоянию на 31 декабря 2021 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**ОАО «МНИПИ» объявляет о выплате дивидендов за 2021 год** в размере 6 (шесть) копеек на одну акцию. Выплата дивидендов производится в срок до 01 октября 2022 года.

УНН 100039847

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Копыльский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **склад** *(составные части и принадлежности: 2 пристройки)* **с инв. № 642/С-40313 общей площадью 552,9 кв. м и складарочник с инв. № 642/С-40314 общей площадью 452,5 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 622850100001002706 площадью 0,8367 га (право аренды по 09.11.2040) по адресу: Минская область, г. Копыль, ул. Тимковичская, 4В/1; 4В/2;**
- **домик-вагон с инв. № 642/С-40312 общей площадью 19,4 кв. м расположенный на земельном участке с кадастровым номером 622850100001002707 площадью 0,0392 га (право аренды по 30.11.2040) по адресу: Минская область, г. Копыль, ул. Тимковичская, 4Г;**
- **кран-балка грузоподъемностью 3,2 тонны 1990 года выпуска, инвентарный номер 144619, расположенный по адресу: Минская область, г. Копыль, ул. Тимковичская, 4В/2.**

*Земельные участки имеют ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **86 760,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **8 676,00** бел. руб.).

**Задаток перечисляется на <u>р/с № BY55BPSB3012108260 0169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»</u>.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

<u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 15.07.2021.

Аукцион состоится **25.04.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.04.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра 8 (01719) 57-8-98.**

УНН 600018956

Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Сморгоньагросервис», ул. Тракторная, 64, 231000, г. Сморгонь** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: ИМУЩЕСТВО, РЕАЛИЗУЕМОЕ ОДНИМ ЛОТОМ, в составе:**

| Наименование (назначение), инвентарный номер | Адрес |
|---|---|
| Водонапорная башня (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) общей площадью 2 кв. м, инв. номер 443/С-21523. **Составные части и принадлежности:** водонапорная башня (А): бак из металлоконструкции с утеплением и стволом из стальных конструкций, имеется металлическая лестница | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кореневский с/с, 31, водонапорная башня, ОАО «Сморгоньагросервис» |
| Свинарник (здание специализированное животноводства) общей площадью 969 кв. м, инв. номер 443/С-7939 | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кореневский с/с, д. Рыбаки, ул. Заречная, 1А |
| Бывший свинарник (здание неустановленного назначения) общей площадью 1075,4 кв. м, инв. номер 443/С-21520 | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кореневский с/с, д. Рыбаки, ул. Заречная, 1А/1 |
| Бывший свинарник (здание неустановленного назначения) общей площадью 923,8 кв. м, инв. номер 443/С-21521. Составные части и принадлежности: Кирпичный красный уголок (3Б1/к) | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кореневский с/с, д. Рыбаки, ул. Заречная, 1А/2 |
| Кормокухня (здание неустановленного назначения) общей площадью 449,6 кв. м, инв. номер 443/С-21522. **Составные части и принадлежности:** подвал ((4А1/к)), кирпичная пристройка (1) | Гродненская обл., Сморгонский р-н, Кореневский с/с, д. Рыбаки, ул. Заречная, 1А/3 |

**Сведения о земельных участках:**
1. **С кадастровым номером 425682408101000072** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания артезианской скважины общей площадью 0,0211 га.
2. **С кадастровым номером 425682408101000001** предоставлен на праве постоянного пользования для ведения подсобного сельского хозяйства (для обслуживания зданий свиноводческой фермы) общей площадью 2,3620 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **80 640,00 белорусских рублей** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **5 %** от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов: 10.00 **26.04.2022 г.**
Окончание торгов: 11.00 **26.04.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **22.04.2022 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: <u>www.ipmtorgi.by</u>

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

# ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» за 2021 год

*Адрес: 220007, г. Минск, ул. Володько, 20, УНП 100036332*

**Информация об ОАО и его деятельности по состоянию на 01 января 2022 года:**

Количество акционеров всего: 554, в том числе: юридические лица – 1, из них: нерезидентов Республики Беларусь – 0, физические лица – 553, из них: нерезидентов Республики Беларусь – 0.

Доля государства в уставном фонде общества – нет.

Начислено на выплату дивидендов – 0.

Фактически выплаченные дивиденды – 0.

Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) – 0.

Обеспеченность акции имуществом общества – 0,07 руб.

Акции, находящиеся на балансе общества – 0.

Выручка от реализации товаров, работ, услуг 575 тыс. руб.

Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию – 707 тыс. руб.

Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (прибыль (убыток) отчетного периода) – (-221) тыс. руб.;

- в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг – (-132) тыс. руб.;

- прочие доходы и расходы по текущей деятельности – (-1) тыс. руб.;

- прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности – (-88) тыс. руб.

Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода), – 0 руб.

Чистая прибыль (убыток) – (-221) тыс. руб.

Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) – (-882) тыс. руб.

Долгосрочная дебиторская задолженность – 0 руб.

Долгосрочные обязательства – 1 924 тыс. руб.

Среднесписочная численность работающих: 15 чел.

Основные виды деятельности, по которым получено 20 % и более выручки: сдача в наем недвижимого имущества 90 %.

Годовое общее собрание акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за 2021 год, состоялось 21.03.2022.

Аудиторское заключение за период с 01.01.2021 по 31.12.2021 подготовлено 17.02.2022 индивидуальным предпринимателем Берёзка Ириной Анатольевной, 220018, г. Минск, ул. Одинцова, д. 7, кв. 135, зарегистрирована 01.08.2013, регистрационный номер 192023084, в полном объеме опубликовано 22.03.2022 на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг.

**Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской (финансовой) отчетности** – бухгалтерская (финансовая) отчетность, сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» на 01.01.2022 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2021 г., при этом совершенные финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Свод правил корпоративного поведения принят к сведению наблюдательным советом, сообщения о проведении собрания содержат достаточную информацию для принятия решения об участии в нем, информация, представляемая при подготовке к проведению собрания позволяет получить полное представление о деятельности общества и принять обоснованное решение по вопросам повестки дня; информация своевременно раскрывается на ЕПФР и в общедоступном СМИ – газете «Звязда».

Сайт общества в сети Интернет – нет.

*Управляющий* *А.Н. Червонец*

# Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества <u>12 апреля 2022 года</u>

| № лота | Наименование и местонахождение недвижимого имущества | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-24924 (наименование – гараж). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Кольцевая, 5А/9, блок 7 | 432,00 | 43,00 |

Имущество продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь. Организация и проведение аукциона проходят в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63 «О совершенствовании работы с имуществом, изъятым, арестованным или обращенным в доход государства».

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.

Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**<u>Аукцион состоится 12 апреля 2022 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1</u>.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и с 14.00 – 17.00 **<u>с 23 марта по 6 апреля 2022 года</u>.**

Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056.

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь http://gki.gov.by/, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, ГП «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

А вы ведалі?

## ВЯСНОВАЕ СОНЦА — КАРЫСЦЬ ЦІ ШКОДА?

**Пасля пахмурнай восені і доўгай зімы няма нічога больш прыемнага, чым яркае вясновае сонейка. Безумоўна, сонечнае святло неабходнае чалавечаму арганізму. Яно здольнае ўзнімаць настрой, паляпшаць самаадчуванне і з'яўляецца выдатным антыдэпрэсантам. Аднак даводзіцца прызнаць: адначасова сонца тоіць і небяспеку. Як атрымліваць ад веснавога сонца асалоду без шкоды для здароўя? Пра гэта расказала ўрач-гігіеніст, загадчык аддзела гігіены працы Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена СМІРНОВА.**

### ГАРМОН РАДАСЦІ, ВІТАМІН D І НЕ ТОЛЬКІ



Многія з нас заўважаюць, што ў сонечныя дні настрой нашмат лепшы, чым у пахмурныя. Уся справа ў серататніне — гармоне радасці, які выпрацоўваецца пад уздзеяннем сонечнага святла. Меnavіта ён зараджае нас пазітывам і надае сіл.

Ультрафіялетавыя прамяні таксама спрыяюць сінтэзу вітаміну D, які рэгулюе абмен і засваенне кальцыю ў арганізме.

— Недахоп кальцыю прыводзіць да хвароб зубоў, ломкасці валасоў і пазногцяў, развіцця астэапарозу, рахіту ў дзяцей, зніжэння імунітэту. Пад уплывам ультрафіялету «сонечнага» вітаміну D выпрацоўваецца значна больш, чым можна атрымаць з ежай і пры прыёме вітамінных комплексаў, але ў такой колькасці, якая неабходная арганізму, што выключае перадазіроўку, — тлумачыць урач.

Спрыяльнае ўздзеянне сонечнае святло аказвае на абменныя працэсы ў арганізме, яно паляпшае работу мозга, страўнікава-кішачнага тракту, узмацняе імунітэт. Пад уплывам сонца сасуды расшыраюцца, насычаючы клеткі кіслародам.

Вясновае сонца спрыяе ўзмацненню працэсаў рэгенерацыі ў дэфармаваных тканках, актывацыі ахоўных уласцівасцяў крывяных клетак. Таксама сонца ўплывае на рост валасоў, зніжае адчувальнасць чалавечага арганізма да таксінаў і ядаў.

Дзякуючы ўздзеянню сонечнага святла ў скуры пачынаюць утварацца біялагічна актыўныя злучэнні, якія адказваюць за стымуляцыю вегетатыўнай нервовай сістэмы.

Яшчэ адна карысная ўласцівасць вясновага сонца — бактэрыцыдны эфект.

### БЕРАЖЫЦЕ ВОЧЫ І СКУРУ

Аднак не варта забываць аб тым, што ранней вясной, калі снег яшчэ не паспеў растаць, адсутнічае лісце, ультрафіялетавае выпраменьванне вызначаецца вялікай інтэнсіўнасцю, што прыводзіць да атрымання залішняй для нашай скуры дозы. Яркія сонечныя прамяні могуць пашкодзіць вочы як непасрэдна, так і адбіваючыся ад снегу.

Сонечнае святло выклікае заўчаснае старэнне, так званае фотастарэнне. Ультрафіялетавыя прамяні пранікаюць углыб скуры, абязводжваючы яе. У выніку змяншаецца тонус скуры і скарачаецца выпрацоўка калагену, скура страчвае эластычнасць. Калі доўгі час праводзіць на сонцы, з'яўляюцца дробныя зморшчыны.

— Інтэнсіўнае ўздзеянне сонечных прамянёў на вочы можа прывесці да апёку сятчаткі. Таму важна выкарыстоўваць сонцаахоўныя акуляры і сонцаахоўны крэм, асабліва ўладальнікам светлай скуры, — раіць Алена Уладзіміраўна.

Пад уплывам сонца ў чалавечым арганізме актыўна ўтвараюцца свабодныя радыкалы, якія знішчаюць клеткі, што можа прывесці да парушэння функцый імуннай сістэмы і, як вынік, узнікнення анкалагічных захворванняў. Каб не дапусціць гэтага, неабходна ўжываць прадукты, якія змяшчаюць антыаксіданты, і пазбягаць працяглага ўздзеяння сонечных прамянёў на скуру.

Скажыце, доктар!..

# НЕСАЛОДКАЕ ЖЫЦЦЁ З ДЫЯБЕТАМ

**Калі дзіця захварэла на дыябет, то гэта на ўсё жыццё. Сёння гэтае захворванне невылечнае. Дыябет мае стагадовую гісторыю, аднак педыятры пра яго недастаткова ведаюць. Пра тое, якія прычыны гэтага захворвання, сімптомы і магчымыя наступствы, мы гутарым з урачом-педыятрам, загадчыкам 1-га педыятрычнага аддзялення 3-й сталічнай дзіцячай клінічнай паліклінікі Аленай МАЙСЕЙШЫНАЙ.**

### З-ЗА ЧАГО ЎСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА?

Прычыны дыябету ў дзяцей могуць быць разнастайнымі. Да самых распаўсюджаных адносяць спадчыннасць, няправільнае харчаванне, парушаны рэжым харчавання, прастудныя захворванні, перанесеныя цяжкія вірусныя хваробы.

### ЛІШНЯЯ ВАГА І НЯПРАВІЛЬНАЕ ХАРЧАВАННЕ

Калі ў сям'і не культывуецца правільнае харчаванне, а дзіця ў вялікай колькасці ўжывае саладкае, мучныя прадукты і шакалад, гэта значыць лёгказасваяльныя вугляводы, нагрузка на падстраўнікавую залозу ў дзіцячым арганізме істотна павялічваецца, тлумачыць урач. Паступова гэта прыводзіць да знясілення падстраўнікавых клетак. У выніку колькасць выпрацоўваемага самастойна інсуліну паступова памяншаецца, а з часам можа і зусім спыніцца.

Развіццё атлусцення заканамерна прыводзіць да назапашвання залішняй тлушчавай тканкі. А яна, у сваю чаргу, становіцца месцам, у якім актыўна прыгнятаецца сінтэз інсуліну.

### ПАСТАЯННЫЯ ПРАСТУДНЫЯ ХВАРОБЫ

Частыя прастудныя захворванні ў дзіцяці правакуюць актывізацыю імуннай сістэмы. Паколькі імунітэт павінен засцерагаць арганізм ад вірусаў і бактэрый, пры частых прастудах ён вымушаны пастаянна выпрацоўваць антыцелы. Калі гэты працэс пачынае насіць хранічны характар, імунная сістэма не спыняецца іх выпрацоўваць нават у тым выпадку, калі непасрэднай пагрозы арганізму няма. Вынікам падобных імунных парушэнняў становіцца тое, што выпрацаваныя антыцелы атакуюць клеткі падстраўнікавай залозы, тым самым самастойна яе знішчаючы. Падвяргаючыся падобным разбурэнням, падстраўнікавая залоза спыняе выпрацоўку неабходнага для паўнавартаснай дзейнасці арганізма інсуліну.

### СПАДЧЫННАЯ СХІЛЬНАСЦЬ

Спадчыннасць з'яўляецца фактарам, які ў значнай меры можа паўплываць на ўзнікненне дадзенага захворвання ў дзіцяці. Калі гаворка ідзе аб спадчыннасці з боку бацькоў, асабліва маці, то верагоднасць узнікнення дыябету ў дзіцяці вельмі высокая. Ён можа выявіцца як у самым маленькім узросце, так і з часам.

### НАСТУПСТВА ПЕРАНЕСЕНЫХ ХВАРОБ

Перанесеныя дзіцем інфекцыйныя захворванні пры шэрагу спадарожных фактараў могуць справакаваць узнікненне хваробы ў якасці цяжкага наступства. Даказана, што на развіццё дыябету ў дзіцяці ўплываюць такія хваробы як вірусны паратыт, гепатыт, ветраная воспа, краснуха.

Заражэнне арганізма вірусамі, якія выклікаюць развіццё названых хвароб, правакуе актывізацыю наймацнейшай імуннай аховы. Выпрацаваныя імунітэтам антыцелы пачынаюць разбураць патагенны вірус, а разам з ім і клеткі падстраўнікавай залозы. У выніку адбываецца збой у інсулінавай выпрацоўцы. Пры гэтым важна адзначыць, што наступленне дыябету пасля перанясення названых хвароб магчымае толькі ў тым выпадку, калі ў дзіцяці ёсць спадчынная схільнасць.

### ГІПАДЫНАМІЯ

Недахоп руху і адсутнасць хоць бы элементарных фізічных нагрузак таксама могуць стаць прычынай развіцця дыябету. Назапашванне тлушчавай тканкі будзе садзейнічаць прыгнечанню выпрацоўкі інсуліну ў арганізме.

### КАБ НЕ ПРАПУСЦІЦЬ ХВАРОБУ...

Часта бывае так, што бацькі пачынаюць турбавацца толькі пасля праявы нейкіх спецыфічных сімптомаў. Плаксівасць, частую змену настрою і раздражняльнасць многія успрымаюць усяго толькі як дзіцячы капрыз. На жаль, у некаторых выпадках такія неабгрунтаваныя паводзіны дзіцяці могуць служыць сігналам ранняга дыябету.

— Справа ў тым, што з пачаткам гэтай хваробы інсулін не выпрацоўваецца ў патрэбнай колькасці. Ён не дапамагае цукру ў поўнай меры засвойвацца арганізмам. Клеткі розных органаў, у тым ліку і мозга, недаатрымліваюць неабходную колькасць энергіі. Гэта становіцца прычынай не толькі раздражняльнасці, але і млявасці, слабасці і стомленасці дзіцяці, — кажа Алена Майсейшына.

Вядома, гэтыя прыкметы не з'яўляюцца галоўным падчас дыягностыкі цукровага дыябету і могуць быць выкліканы іншымі хваробамі ці рэакцыямі дзіцячага арганізма. Але ўсё ж, паколькі яны дапамагаюць западозрыць нядобрае ў здароўі дзіцяці, не варта іх ігнараваць. Сігналізаваць аб пачатку захворвання могуць і іншыя змены, якія бацькі таксама не павінны пакідаць без увагі: дзіця ўвесь час просіць піць, у яго не атрымліваецца прагнаць смагу, заўважаецца павышаны апетыт і адначасовая страта вагі, часам бываюць ваніты, дзіця скардзіцца на частую млоснасць, назіраецца пачашчанае мочаспусканне.

Пры праяўленні некалькіх падобных прыкмет або хоць бы адной з іх варта звярнуцца да доктара, які прызначыць неабходную дыягностыку.

### СІМПТОМЫ ЗАХВОРВАННЯ

Праз пэўны час хвароба пачынае выяўляцца спецыфічнай сімптаматыкай. Да самых частых сімптомаў, якія суправаджаюць развіццё цукровага дыябету ў дзіцяці, адносяць раны, што доўга не загойваюцца, частыя грыбковыя пашкоджанні скуры, страту вагі і запаволены рост, праблемы з фізічным развіццём, павышаны апетыт і смагу, частыя мочаспусканні і ў некаторых выпадках начное нетрыманне мачы.

У кожнага сімптому свае прычыны, і яны становяцца рэакцыяй арганізма на недахоп інсуліну.

Паколькі недастатковая колькасць інсуліну спрыяе назапашванню цукру ў крыві, ныркам становіцца цяжка выконваць сваю фільтрацыйную функцыю. Нагрузка істотна павялічваецца, і яны спрабуюць атрымаць з арганізма дадатковую вадкасць, ад чаго ў дзіцяці і з'яўляецца дакучлівае адчуванне смагі.

Дзеці могуць скардзіцца на сухасць у роце, прыкметную сухасць скуры і яе лушчэнне. Такая сітуацыя небяспечная тым, што, не разумеючы таго, што адбываецца, дзіця ў велізарных колькасцях можа піць сокі, газіроўку і іншыя напоі, якія таксама змяшчаюць цукар. Падобнае ўжыванне шкоднай вадкасці ў вялікіх колькасцях толькі пагаршае развіццё дыябету ў дзяцей.

Павышаны апетыт і адчуванне голаду з'яўляюцца ад таго, што клеткі ўсяго арганізма адчуваюць энергетычны голад.



Глюкоза проста вымываецца з арганізма разам з мачой, не сілкуючы пры гэтым яго на належным узроўні. Галодныя клеткі пачынаюць пасылаць у мозг сігнал аб тым, што яму недастаткова ежы і пажыўных рэчываў. Дзіця можа паглынаць ежу вялізнымі порцыямі, але пры гэтым адчуванне насычэння ў яго захоўваецца ненадоўга.

Нягледзячы на павышаны апетыт, дзіця, якое захварэла на цукровы дыябет, прыбаўляць у вазе не будзе. З-за пастаяннага энергетычнага голаду дзіцячы арганізм змушаны шукаць сабе альтэрнатыўныя крыніцы сілкавання. У арганізме можа пачацца інтэнсіўны працэс разбурэння тлушчавай і мышачнай тканак. Таксама ў дзіцяці з дыябетам можа моцна запаволіцца рост цела.

З-за пастаяннай смагі дзіця пачынае спажываць вялікую колькасць вадкасці, што, у сваю чаргу, прыводзіць да пачашчанага мочаспускання. Мачавы пузыр пры вялікай колькасці пітва практычна ўвесь час знаходзіцца ў напоўненым стане. Калі днём дзіця проста часта ходзіць у прыбіральню, то ўначы кантраляваць гэты працэс яму становіцца цяжка.

—Турбавацца варта ў тым выпадку, калі начнога мочаспускання ў ложак у дзіцяці раней не было. Пры змене пасцелі трэба абавязкова звярнуць увагу на мачу. Яна можа мець рэзкі, непрыемны пах ацэтону, быць ліпкай навобмацак і пасля высыхання пакідаць ненатуральны белы след, — раіць звярнуць увагу ўрач.

### НАСТУПСТВЫ ДЫЯБЕТУ Ў ДЗІЦЯЧЫМ УЗРОСЦЕ

Адной з галоўных праблем гэтай хваробы з'яўляецца здольнасць дыябету паніжаць імунітэт дзіцяці. Любыя інфекцыйныя захворванні могуць суправаджацца сур'ёзнымі ўскладненнямі. Напрыклад, банальная прастуда можа перацякаць у пнеўманію. Любыя драпіны, ранкі, парэзы могуць не гаіцца працяглы час. Магчымае частае заражэнне грыбковымі вірусамі, паколькі імунітэт перастае ахоўваць дзіцячы арганізм належным чынам.

Зніжэнне вастрыні зроку часта становіцца наступствам гэтага захворвання. Таксама магчымае яшчэ адно сур'ёзнае ўскладненне, вядомае пад назвай «дыябетычная ступня». У выпадку, калі ўзровень цукру доўгі час не кантралюецца, у арганізме пачынаюць адбывацца незваротныя паталагічныя змяненні касцёва-мышачнай тканкі, сасудаў і нерваў. Вынікам становіцца пашкоджанні канечнасцяў, аж да ўтварэння гангрэны.

### КАБ ДЗІЦЯ НЕ ЗАХВАРЭЛА

Каб зберагчы дзіця ад гэтага захворвання, найперш трэба сачыць за рацыёнам. Малое павінна харчавацца дробна, але часта, каля 5-6 разоў на дзень. Вядома, ежа павінна быць збалансаванай і ўтрымліваць усе неабходныя для росту арганізма вітаміны. Цалкам выключаць салодкае з рацыёну здаровых дзяцей не варта, але колькасць такіх прадуктаў павінна строга кантралявацца.

Калі дзіця ў раннім узросце ўжо мае лішнюю вагу або пачатковую стадыю атлусцення, бацькам настойліва рэкамендуецца звярнуцца па кансультацыю да эндакрынолага. У выпадку неабходнасці ўрач дасць свае рэкамендацыі, дапаможа распрацаваць сістэму правільнага харчавання.

Паколькі фізічныя нагрузкі спрыяюць растварэнню глюкозы ў крыві і зніжаюць узровень цукру, імі не варта грэбаваць. Каля 2-3 разоў на тыдзень дзіця павінна займацца даступнымі і пасільнымі фізічнымі практыкаваннямі.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

**Лот № 1:** главный производственный корпус общей площадью 3765,8 кв. м, инв. № 611/С-32645, расположенный на земельном участке площадью 1,5960 га с кадастровым номером 620450100001003603 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 1.
Начальная цена с НДС (20 %) – **385 819,20 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**38 581,00 бел. руб.**).

**Лот № 2:** административно-бытовой корпус общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **176 633,73 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**17 663,00 бел. руб.**).

**Лот № 3:** здание котельной общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастрофсборник общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **117 784,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**11 778,00 бел. руб.**).

**Лот № 4:** автовесовая общей площадью 193,2 кв. м, инв. № 611/С-32800, расположенная на земельном участке площадью 0,0435 га с кадастровым номером 620450100001003598 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 10.
Начальная цена с НДС (20 %) – **28 706,40 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**2 870,00 бел. руб.**).

**Лот № 5:** блок вспомогательных помещений общей площадью 515,2 кв. м, инв. № 611/С-32646, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – **44 010,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**4 401,00 бел. руб.**).

**Лот 6 №:** навесной склад общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – **55 701,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**5 571,00 бел. руб.**).

**Лот № 7:** насосная станция 2-го подъема общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **33 895,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**3 389,00 бел. руб.**).

**Лот № 8:** шоха № 1 общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2 общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **286 237,80 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены (**28 623,00 бел. руб.**).

**Стоимость лотов снижена на 55 %.**
**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169 330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017 и «Звязда» от 23.04.2018, 19.12.2018, 12.03.2019, 05.09.2019, 17.12.2019, 03.04.2020, 12.08.2020, 02.12.2020, 17.07.2021, 07.12.2021.
Торги проводятся в соответствии с положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).
Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).
